№ 14 (659) 14 красавіка 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады


**Доктар Аўтахаус**

Старонка 4



**Таямніцы Навагрудскага замка**

Старонка 12



**На прэзідэнцкай лыжні**

Старонка 13



## У НУМАРЫ


**Станіслаў Шушкевіч: Я лётаў на гэтым самалёце**

двойчы. А Качынскі, як ніхто, разбіраўся ў беларускай сітуацыі. **Старонка 8.**

**Прэзідэнт не дазваляў сабе купіць новы самалёт**

У Польшчы больш ніхто не лётаў старэнькімі Ту-154 — акрамя кіраўнікоў дзяржавы. **Старонка 10.**

**Небяспечная прафесія**

Лех Качынскі стаў восьмым прэзідэнтам у свеце, які загінуў у выніку авіякатастрофы. **Старонка 8.**

**Дзмітрый Гурневіч: «Польшчай кіруюць адказныя эліты»**

Як павёў сябе пасля катастрофы самалёта з элітай грамадства польскі дзяржаўны і нацыянальны механізм? **Старонка 9.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.






# Неабвешчаная жалоба

Адна толькі Беларусь абмежавалася спачуваннямі. Лукашэнка не абвесціў жалобы па ахвярах катастрофы самалёта прэзідэнта Качынскага. **Старонка 8.**



Юлія Дарашкевіч

**На фота: сотні людзей прынеслі кветкі і свечкі да пасольства Польшчы ў Мінску.**

## Расія блаславіла сілавы захоп улады ў краіне СНД



**Здымак зроблены ў кабінеце прэзідэнта Бакіева, статус якога цяпер не ясны.**

Спускавым кручком анархіі ў Бішкеку стала стральба Службы аховы прэзідэнта ў дэманстрантаў. **Старонка 7.**

## І свіныя хвасты, і дзевак у саўну

Экс–кіраўніка Кастрычніцкага раёна Мінска абвінавачваюць у букеце карупцыйных злачынстваў.

Былы кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Міхаіл Цыган зняміў крэсла начальніка на лаву для падсудных. Сярод абвінавачанняў — хабарніцтва, злоўжыванні, незаконныя дзеянні са зброяй і боепрыпасамі. Галоўны сведка — асабісты кіроўца начальніка.

### Везлі нават памперсы

У зале Мінскага абласнога суда чыноўнік трымаўся спакойна і нават часам пасміхаўся з абвінавачванняў.

Асабліва добра ўсім запомніўся дзень выбараў у 2008 годзе. Цыган запрасіў сваіх намеснікаў у саўну, каб «падвесці вынікі выбараў».

Працяг на старонцы 5.

# Канзас, Красата і Крыжаноўскі ў адной акрузе

Цікавы выбар будзе ў жыхароў Заслаўскай сталічнай акругі №40 на мясцовых выбарах. Сярод кандыдатаў Юрый Канзас, Ягор Красата, Яўген Крыжаноўскі, а таксама Крысціна Ачарэтная.

Юрый Канзас працуе начальнікам упраўлення адукацыі адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска. Ён, напэўна, і ёсць кандыдат ад улады. Ягор Красата — студэнт першага курса гістфака БДУ, актывіст БРСМ і «Белай Русі». Яўгену Крыжаноўскаму залішнія прадстаўленні не патрэбныя. Вядомы сатырык некалі вылучаўся нават на пасаду прэзідэнта. Цяпер ён ідзе на выбары ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Хрысціна Ачарэтная прадстаўляе Аб'яднаную грамадзянскую партыю. Працуе вядучым спецыялістам сектара метадалогіі рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер».

Аднак такі дастойны выбар ёсць не ва ўсіх. Усяго зарэгістравана 25035 чалавек, г.зн. конкурс будзе 1,17 чалавекі на адно дэпутацкае месца. 80% акруг – безальтэрнатыўныя.

Мясцовыя выбары пройдуць 25 красавіка. Усяго павінен быць абраны 21301 дэпутат у 1495 мясцовых саветаў.

Апазіцыйныя партыі змаглі зарэгістраваць 240 кандыдатаў. Па Мінску ад апазіцыі ідзе ў асноўным моладзь.

**Зміцер Панкавец**

**Цюхай адсюль**

По Кастрычніцкай выбарчай акрузе Мінска балатуецца былы актывіст БРСМа Уладзімір Цюхай. Праславіўся ён пасля таго, як прывёў на суд над палітвязнем Аляксандрам Баразенкам поўную залу студэнтаў. Калі маці Баразенкі пачала выказваць яму прэтэнзіі, то Цюхай проста яе піхнуў у плечы. Раней сябар Камуністычнай партыі Цюхай з'яўляўся галоўным спецыялістам БРСМ па Цэнтральным раёне. Цяпер жа на выбары ідзе як беспрацоўны.




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Расія капае тунэль у Еўропу

Пабудова газаправода Nord Stream знізіць значэнне Беларусі для Масквы.

Пачалося будаўніцтва падводнай часткі газаправода з Расіі ў Нямеччыну пад Балтыйскім морам. Яго адклалі на некалькі дзён праз позняе раставанне лёду на Балтыцы моры ў выніку звышхалоднай зімы.

Газаправод па дне мора мае быць запушчаны ў 2011 годзе. Даўжыня яго складзе 1224 кіламетры, а меркаваны кошт ацэньваецца ў 7,5 млрд еўра. Яго будуе расійска-нямецкі кансорцыум. Фінляндыя дала згоду першай, Швецыя — другой. Польшча і краіны Балтыі здолелі адтэрмінаваць пачатак выканання праекта, але не здолелі яго заблакаваць.

Беларусь выказвала сваё незадавальненне. Але як не краіна ЕС не мела механізмаў уплыву на прыняцце рашэння.

Адначасова Расія вядзе пабудову нафтаправода да балтыйскага ўзбярэжжа ў абыход Беларусі і Балтыі.

**Мікола Бугай**




**У Мінску ўручылі прэмію імя Ежы Гедройца, заснаваную Польскім інстытутам у 2000-м годзе. Раней прэмія ўручалася журналістам за найлепшыя матэрыялы на беларуска-польскую тэматыку. Цяпер — усім творцам за новыя ідэі ў беларуска-польскім дыялогу. Сёлета было вырашана ўзнагародзіць адразу двух пераможцаў. Імі сталі кампазітар і дырыжор Уладзімір Байдаў і выдавец ды публіцыст Валеры Булгакаў.**




## Гродзенскі нумар ARCHE

Часопіс цалкам прысвечаны Гродну і ахоплівае гісторыю гэтага каралеўскага горада ад XVIII ст. да сучаснасці.

Вялікую частку матэрыялаў, змешчаных у часопісе, напісалі гарадзенцы–гісторыкі — Алесь Краўцэвіч, Андрэй Вашкевіч, Альбіна Семянчук, Андрэй Чарнякевіч, Ганна Паўлоўская, Юры Гардзееў. Апошні выступіў таксама ў ролі рэдактара нумара.

Новы ARCHE змяшчае вялікую колькасць ілюстрацый, у тым ліку ўнікальных фота з жыцця горада ў розныя часы.

**АП**

## СЦІСЛА

### МЗС абураецца, што Беларусь не запрасілі на саміт у ЗША

МЗС крытыкуе Вашынгтон у сувязі з тым, што 12—13 красавіка ў Вашынгтон на саміт па пытаннях ядзернай бяспекі не былі запрошаныя прадстаўнікі Беларусі. Прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных нагадвае, што Беларусь першая і добраахвотна адмовілася ад стратэгічнага ядзернага наступальнага патэнцыялу, унёсшы тым самым вялікі ўклад у справу раззбраення. Саміт у Вашынгтоне праводзіцца з ініцыятывы прэзідэнта ЗША Барака Абамы, у ім бяруць удзел 47 дзяржаваў. Да Беларусі па-ранейшаму ставяцца як да дыктатуры.

### Саўчанка атрымаў пасаду атамшчыка?

Былы губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір Саўчанка, вызвалены з пасады, атрымаў прызначэнне ў Дэпартамент па атамнай энергетыцы Беларусі. Да таго ж, Уладзімір Саўчанка атрымаў пасаду ў складзе дырэкцыі беларускай АЭС, што будуецца. Але пакуль афіцыйных дадзеных аб тым, якое месца яму дасталася, няма. Абавязкі старшыні Гродзенскага аблвыканкама ўжо 2,5 месяца выконвае першы намеснік Саўчанкі Іван Жук.

### Помнік Марфіцкаму і Жураўлевічу

Помнік беларускім лётчыкам Аляксандру Марфіцкаму і Аляксандру Жураўлевічу, што трагічна загінулі на міжнародным авіяшоу, урачыста адкрыты каля горада Радам. Ініцыятарамі ўшанавання памяці афіцэраў выступілі мясцовы пробашч і жыхары. Лётчыкі, адводзячы самалёт ад населенага пункта, цаной свайго жыцця прадухілілі гібель многіх людзей.

**СМ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю

Вользе А. з Любанскага раёна.
Аляксандру А. з Нясвіжскага раёна.
Сяргею Ю. з Лепельскага раёна.
М.Р. з Рэчыцкага раёна.
А.П., С.В. з Гродна.
Пятру К. з Мастоўскага раёна.
Андрэю К. з Бярозаўскага раёна.
В.Г., Фёдару П., З.Б., Мікалаю А., Уладзіміру Г., Наталлі Л., А.П., Т.П., Т.Т., Таццяне К., С.К., Валянціне Г., А.С., Г.К., Алене Л., А.С., З.А., Вікенцію М., Людміле М., Н.Ж., А.П., С.К., Марыі М., І.Л., С.Я., Р.М., Валерыі Н., Віктару Б., Н.Ш.,Івану К., А.Б., Ізмаілу А., Максіму В., Міхаілу К., Але К., А.Р., Ірыне Ц., Т.В., Б.С., Дзмітрыю Р., Аляксандру М., В.Ц., С.К., Л.Г., Міхаілу Ш., В.Н., А.Р., Юрыю Л., П., Я.Ш., Ігару С. з Мінска.

# Расія блаславіла сілавы захоп улады ў краіне СНД

**Спускавым кручком анархіі у Бішкеку стала стральба Службы аховы прэзідэнта ў дэманстрантаў.**

Каляровыя рэвалюцыі адбываліся ў адказ на сфальшаваныя выбары. У Кіргізіі цюльпаны выраслі проста так. Бакіеў сканцэнтраваў уладу ў сваіх руках і бязлітасна распраўляўся з апанентамі. Тыя адказалі гвалтам на гвалт.

Пяць гадоў таму падзеі ў Кыргызстане запісалі ў лік «аранжавых рэвалюцый» на тэрыторыі былога СССР. Спачатку ўлада памянялася ў Грузіі, потым — у Украіне. Кіргізскія падзеі заходнія журналісты ахрысцілі «цюльпанавай рэвалюцыяй».

Пасля парламенцкіх выбараў — натуральна, сфальшаваных, некалькі тысяч радыкальна настроеных дэманстрантаў у красавіку 2005 года выйшлі на вуліцы кіргізскіх гарадоў з патрабаваннямі адстаўкі карумпаванай улады. Беспарадкі перараслі ў хаос з элементамі гвалту. Уражаны прэзідэнт Аскар Акаеў з'ехаў у эміграцыю ў Маскву, а ягонае месца заняў апальны прэм'ер-міністр Курманбек Бакіеў.

Падчас сёлетніх падзей не пакідала настойлівае адчуванне дэжа-вю. Здавалася, усё гэта мы ўжо бачылі. Зноў некалькі тысяч чалавек на плошчы Ала-Тоа, зноў патрабаванне адстаўкі ўладаў. Зноў прэзідэнт вымушаны пакінуць свой фатэль і збегчы са сталіцы.

На гэты раз прычынай для хваляванняў стаў рост цэнаў на святло і цяпло, нарастанне аўтарытарных тэндэнцый за час кіраўніцтва Бакіева (на выбарах у ліпені 2009 года дзейсны прэзідэнт Кыргызстана набраў больш за 80% — знаёмая беларусам лічба) і вялікая карупцыя ў верхніх эшалонах улады.

Напярэдадні гэтых падзей у Кыргызстане быў заблакаваны доступ на шэраг расійскіх сайтаў, спынілася рэтрансляцыя радыё «Свабода». Прэзідэнт Бакіеў прыйшоў да ўлады ў выніку падтрыманай Захадам рэвалюцыі, абапіраючыся на поўдзень краіны. Аднак, абаснаваўшыся ў Бішкеку, на дэмакратычныя абяцанні забыўся. Атачыў сябе сваякамі і абраў кішэнны парламент.

> Пуцін: «Калі прэзідэнт Бакіеў прыходзіў да ўлады, ён вельмі жорстка крытыкаваў адхіленага прэзідэнта Акаева за сямейнасць, за тое, што ў эканоміцы Кыргызстана кругом сядзелі сваякі. У мяне такое ўражанне, што спадар Бакіеў наступае на тыя самыя граблі».

Рэпрэсіі вымусілі апазіцыю згуртавацца. 17 сакавіка ў Бішкеку прайшоў курултай (з'езд) апазіцыі, дзе лідэрам была абраная сацыял-дэмакрат Роза Атунбаева.

Яшчэ за савецкім часам Атунбаева працавала ў Міністэрстве замежных справаў СССР, якім кіраваў Эдуард Шэварнадзэ. Пасля 1991 года яна доўгі час працавала паслом Кыргызстана ў заходніх краінах — ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі. Тры гады адпрацавала міністрам замежных справаў пры Акаеве, але сышла, паколькі «адчувала, што краіна становіцца ўсё больш таталітарнай». Атунбаева мае адносную вядомасць за межамі краіны.

Новая рэвалюцыя ў Кыргызстане пачалася 6 красавіка з Таласа, калі пасля мітынгу апазіцыі быў захоплены будынак абласной адміністрацыі. Варта зазначыць, што апазіцыянераў на тым мітынгу не было і тысячы чалавек. Спробы міліцыі і спецназа вярнуць будынак не мелі плёну. Паўстанцы іх разброілі, а некаторыя з праваахоўнікаў трапілі ў рэанімацыю.

**Працяг на старонцы 7.**

# Рачкоўскі прэзентаваў у палаце даклад пра мяжу на беларускай мове

**Гэта было першае за доўгі час беларускамоўнае абмеркаванне ў лукашэнкаўскім парламенце.**

На чарговай сесіі дэпутаты палаты прадстаўнікоў прынялі закон пра дзяржаўную мяжу з Украінай. Ратыфікацыя дамовы з Украінай, такім чынам, расцягнулася на 13 гадоў.

Што цікава, старшыня Памежнага камітэта генерал-маёр Ігар Рачкоўскі свой даклад па законе прачытаў на беларускай мове. У выніку і дэпутаты, і старшыня таксама збіліся на беларускую.

«Мая пазіцыя ясная. Калі вы заўважылі, пры ўездзе ў Рэспубліку Беларусь першы запіс пра назву краіны ідзе на беларускай мове. Бо гэта наша ідэнтыфікацыя. Калі мы хочам, каб нас паважалі, павінны паважаць самі сябе», — патлумачыў Рачкоўскі «Комсомольской правде».

Ігар Рачкоўскі нарадзіўся ў Смаргоні ў 1968-м. Доўгі час працаваў у сілавых структурах, у тым ліку ў контрвыведцы КДБ і Асобнай службе асаблівых мерапрыемстваў. Сярод урадоўцаў вылучаецца тым, што мае пяцёра дзяцей. Памежнікаў узначаліў у 2007-м.

Апошнім часам беларускую мову стаў ужываць не толькі Ігар Рачкоўскі, але і генеральны пракурор Рыгор Васілевіч. Па-беларуску Васілевіч размаўляў на нядаўняй сустрэчы са студэнтамі БДУ.

**МБ, ЗП**



БЕЛТА

# Насельніцтва не павялічылі, а нафту з Венесуэлы пачалі пастаўляць

Плануецца, што 20 красавіка Лукашэнка выступіць са штогадовым пасланнем да народа і парламента. Што гаварыў і абяцаў кіраўнік дзяржавы падчас падобных зваротаў цягам апошняй пяцігодкі?

## 2006. Вывесці ў лік высокаразвітых

Зварот адбываўся праз два месяцы пасля прэзідэнцкіх выбараў. У той час хадзіла мноства чутак пра стан здароўя першага чалавека ў краіне. Падчас паслання Лукашэнка таксама раз-пораз пакашліваў. Можа, менавіта таму лідэр быў нязвыкла кароткі (45 хвілін) і сухі.

Лукашэнка паставіў задачу «вывесці нашу краіну ў лік высокаразвітых еўрапейскіх дзяржаваў», чым фактычна паўтарыў перадвыбарчыя абяцанні лідэра апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча. Але ніякай крытыкі ў бок апазіцыі не прагучала.

Тады ж упершыню за доўгі час было сказана пра эканамічную лібералізацыю. «Гэтую балбатню трэба скончыць з тэлевізарамі і іншымі халадзільнікамі, — строга загадаў ён. — «Віцязі» і «Гарызонты», з новага года да мяне па субсідыі болей не прыходзьце!»

## 2007. Рэзервныя пастаўкі нафты

Зварот Аляксандра Лукашэнкі да нацыянальнага сходу быў вытрыманы ва ўзвінчаным тоне і насычаны патрабаваннямі адміністрацыйнага ўмяшання ў эканоміку.

«Незалежная Беларусь — наш надзейны і дастойны дом», — пачаў А.Лукашэнка. Але разам з тым: «Альтэрнатывы адносінам з Расіяй няма».

Тады ж Лукашэнка пачаў гаварыць пра важнасць забеспячэння рэзервных варыянтаў паставак нафты. Тое, што ў нейкай ступені, дзякуючы Венесуэле, атрымалася рэалізаваць толькі сёлета.

Па словах Лукашэнкі, з 2008 года субсідыі будуць накіроўвацца толькі ў найноўшыя, навукаёмістыя тэхналогіі. Было заяўлена пра неабходнасць рэзкага скарачэння льготаў у сацыяльнай сферы, што ў гэты год і было ж рэалізавана.

Кіраўнік падверг рэзкай крытыцы Міністэрства будаўніцтва і яго праектныя інстытуты. Тое ж самае прагучала літаральна некалькі тыдняў таму на нарадзе па будаўніцтву. Тры гады прайшло, і ён у жывым эфіры зноў паабяцаў пасадзіць былога міністра архітэктуры і будаўніцтва Курачкіна.

## 2008. Павялічым насельніцтва ў тры разы

«Колькасць насельніцтва павінна ўзрасці ў тры разы!» — паставіў амбітную задачу А.Лукашэнка. Тым не менш, колькасць жыхароў РБ усё адно змяншаецца з кожным годам.

Яшчэ адна з пастаўленых задачаў — уваходжанне Беларусі ў лік сусветных лідэраў. Можа, таму гучалі ад Лукашэнкі нязвыклыя словы пра мадэрнізацыю і грамадзянскую супольнасць.

Падчас таго паслання Лукашэнка крыху абсек апетыт стваральнікаў «Белай Русі». «Я не прымаю такіх структур. Я абапіраўся толькі на народ, давяраю толькі народнай думцы», — сказаў ён. Тым не менш, людзей у «БР» загналі і трымаюць.

## 2009. Праца па начах

Тон прамовы быў досыць спакойны, толькі некалькі разоў кіраўнік дзяржавы зрываўся на абразы ў бок апазіцыі, называючы іх «шарлатанамі, адшчапенцамі і адмарозкамі».

Лукашэнка запэўніваў, што «ў Беларусі няма крызісу, трэба проста працаваць». «Ніякіх скарачэнняў на прадпрыемствах не будзе», — абазначыў Лукашэнка дзяржаўную пазіцыю, але запатрабаваў строгай працоўнай дысцыпліны і працы «па начах, калі будзе патрэбна».

«Палітычнай лібералізацыі ў нас і так дастаткова», — Лукашэнка быў катэгарычны. Стары воўк паказаў, што ўпэўнена трымае зграю, абвяргаючы плёткі, што маладая каманда кіруе ягонай палітыкай: «Родныя мае, я яшчэ ў стане сам фармаваць палітыку ўнутры краіны».

Упершыню не было выразаў кшталту «наша Расія».

**Зміцер Панкавец**

# Ветэраны пікетавалі рэдакцыю «Народнай волі»

**Яны пратэставалі супраць публікацыі ўспамінаў Іллі Копыла аб праўдзе вайны ў Лепельскім і Докшыцкіх раёнах.**

6 красавіка амаль кожны ветэран меў нейкі транспарант, ці расцяжку. На іх было напісана:

«Долой клевету», «Нацизм не пройдет», «Позор фальсификаторам истории», «Середич! Не позволим унижать ветеранов», «Победили врагов — победим клеветников».

Нешта падобнае даводзілася бачыць тры гады назад, калі такія самыя абураныя пенсіянеры разам з бээрэсэмаўцамі пікетавалі эстонскае консульства. Тады прычынай стаўся перанос помніка Бронзавага салдата.

Цяпер жа ветэраны пратэставалі супраць публікацыі ў газеце артыкула Іллі Копыла «Нябышына. Вайна», які, на іх думку, непраўдзіва адлюстроўвае падзеі Вялікай Айчыннай на тэрыторыі Беларусі.

Побач з пікетоўцамі стаялі тры брытагаловыя дзецюкі ў спартовых нагавіцах. Дзяржаўныя СМІ ведалі пра акцыю загадзя, бо побач з рэдакцыяй ужо дзяжурылі бэтэшнікі.

Усяго акцыя доўжылася хвілінаў дзесяць. Потым старшыня мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Анатоль Адоньеў, які і кіраваў мерапрыемствам, прапанаваў занесці транспаранты ў кабінет да галоўнага рэдактара «Народнай волі» Іосіфа Сярэдзіча.

Дарэчы, Адоньеў нарадзіўся толькі ў 1937 годзе ў Стаўрапальскім краі Расіі. Якую вайну мог бачыць гэты чалавек, сказаць цяжка. І што ён можа ведаць пра падзеі ў Беларусі, дзе людзі апынуліся між агнём і полымем?

Іосіфа Паўлавіча ў рэдакцыі не аказалася. І «ахвярай» абураных пенсіянераў стала шэф-рэдактар «Народнай волі» Святлана Калінкіна.

«Нашто вы пішаце паклёпы? Вы толькі ўмееце ліць гразь на нашы галовы», — крычалі дзядулі. «Мне заўтра ў школу ісці выступаць, а што я ім скажу, калі такое ў газетах пішацца», — задаваўся рытарычным пытаннем іншы.

Калінкіна выйшла да пратэстоўцаў. Там лінчаваць яе не сталі, але крычалі пенсіянеры кожны сабе. «Вы пішаце, што немцы такія харошыя, немцы нам дапамагалі», — казала адна бабуля. «Сціхні. Нават слухаць такое не хочацца», — сыкнуў на яе паплечнік па барацьбе.

«Вы ўжо Бандэру героем робіце. Даражыце гонарам», — працягвалася завыванне.

Калінкіна адказала, што кожны чалавек мае права на сваю пазіцыю. І задача газеты гэтую пазіцыю перадаць. Шэф-рэдактар сказала, каб ветэраны накіравалі свой ліст у рэдакцыю, і яны яго абавязкова надрукуюць.

«Усе чулі?» — запытаўся галоўны.

На гэтым акцыя і скончылася. Вось толькі ці была яна апошняй?

**ЗП**

# Доктар Аўтахаус

**Узаконеныя перакупшчыкі з радасцю забяруць ваш аўтамабіль для продажу. Што ўзамен — толькі грошы ці клопат у дадатак?**




У Еўропе патрыманыя машыны прадаюцца ў аўтахаусах. У Беларусі дамінуюць прымітыўныя аўтарынкі.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Што такое аўтахаус? Часцяком такім словам называюць любую краму, якая прадае машыны. Мы ж спынімся на «аўтахаусах» у больш вузкім значэнні слова — гэта кампаніі, якія працуюць не з новымі аўто, а з былымі ў карыстанні. Напрыклад, бяруць іх на камісію для продажу ці прывозяць старыя машыны з Еўропы і Амерыкі.

### Няскончаная прыступка да цывілізацыі

У Беларусі працуе дзясятак такіх крам. Асноўныя — «Аўтаподыум», «4 колы», «Мегаполіс», «МуCar». Іх можна было б назваць чарговай прыступкай на шляху да цывілізаванага рынку — прынамсі тыя, што знаходзяцца пад дахам і маюць у штаце кваліфікаваных кансультантаў. Але гэта ідэальны варыянт.

Пакуль жа сітуацыя на аўтарынку Беларусі сведчыць пра адваротнае. Водгукі ў інтэрнэце — спрэс адмоўныя. Некаторыя пакрыўджаныя даходзяць да абароны сваіх правоў. У Беларускім таварыстве спажыўцоў сабраўся стос прэтэнзій да аўтахаусаў. Яшчэ больш людзей нават не пачынаюць папяровую цяганіну.

«На адной машыне мне падрапалі бампер, на другой я знайшоў расколіну лабавога шкла па ўсёй даўжыні знізу. Гэта яны свае абʼявы з цаной палівалі ў маразы кіпнем, каб не трэба было адскрабаць... І ні за адну з сітуацый не заплацілі, маўляў, вы ж нічога не дакажаце. Уладальнік аўтахауса — былы перакупшчык з Малінаўкі, таму і стаўленне да кліентаў у яго адпаведнае», — расказвае адзін з тых, каму не пашчасціла звярнуцца ў аўтахаус.

> «Я знайшоў расколіну лабавога шкла па ўсёй даўжыні. Гэта яны свае абʼявы з цаной палівалі ў маразы кіпнем, каб не трэба было адскрабаць».

Дый ашчадзіць, купляючы машыну ў аўтахаусе, складана. Аўто каштуюць столькі ж, колькі на рынку, ці нават даражэй. Накрутка ёсць, а гарантыі — няма. Гарантыю на некалькі месяцаў можна атрымаць на лічаныя аўто — і тое толькі пры праходжанні тэхагляду і рамонту за дадатковыя грошы.

### Галоўнае — збыць

Калі паглядзець на зʼяву з іншага боку, з боку прадаўцоў, атрымліваецца больш аптымістычная карціна. Прадаць свой аўтамабіль аўтахаусу і атрымаць 70—80% ад рынкавай цаны за пару дзён — даволі выгадны варыянт, калі падціскае час. Папулярную машыну ўвогуле адарвуць з рукамі. Калі ў машыне ёсць хібы, цана ўпадзе яшчэ ніжэй, праўда, для наступнага пакупніка аўто будзе хутчэй за ўсё прадавацца як беспраблемнае.

Аўтахаус — яшчэ і выйсце для тых, хто перадусім цэніць свой час, а не грошы. Аднойчы выставіўшы сваё аўто на продаж, пра яго можна часова забыцца. Машына можа стаяць на продажы і месяц, і два, пакуль яе нарэшце не знойдзе новы гаспадар.

Атрымліваецца, што аўтахаусы выгадныя для тых, хто хоча прадаць, а не купіць.

**Плюсы аўтахаусаў**

+ Перакладванне са сваіх плячэй працы па пошуку купца
+ Магчымасць тэрмінова атрымаць 80% ад рынкавай цаны машыны
+ Магчымасць уліку старога аўто ў кошт новага
+ Магчымасць купіць аўто ў крэдыт

**Мінусы аўтахаусаў**

– Уласніку выплачваецца заніжаная цана машыны
– Складана збыць аўтахаусу праблемны аўтамабіль
– Аўтахаус не адказвае за нанесеныя машыне пашкоджанні на стаянцы

**Яўген Васількоў**

# Аддаў грошы махлярам — атрымай таннае жыллё?

**Мінгарвыканкам працягнуў руку дапамогі падманутым дольшчыкам.**

Скандал з дольшчыкамі, якія ўклалі грошы ў дом на скрыжаванні вуліц Прытыцкага і Лабанка ў Мінску, над самым метро «Каменная Горка», разгараўся яшчэ ўлетку 2009 года, калі выявілася недарэчная сітуацыя. У забудоўшчыка, кампаніі «Тэрабудінвест», знайшліся як амаль 300 прызнаных дольшчыкаў, так і больш за 400 непрызнаных — гэта людзі, якія складалі дамовы з фірмай-двайніком і аддалі за сваё будучае жыллё наяўнымі каля $15 мільёнаў даляраў.

> «Калі ў мяне кашалёк выкралі, дазвольце мне цяпер бясплатна ездзіць у метро на тую суму, якая была ў кашальку!»

Фірма-махляр збанкрутавала, таму падманутыя ўкладчыкі не здолелі вярнуць свае грошы. Пацярпелыя стварылі грамадскае абʼяднанне «Падманутыя грамадзяне-дольшчыкі», якое пачало змаганне. Вынік напружанай працы — прапанова, якую днямі дольшчыкі атрымалі ад Мінгарвыканкама.

Кіраўніцтва горада прапанавала грамадскаму абʼяднанню ўзгадніць спіс з 50 чалавек для будаўніцтва кватэр у панэльным доме ў мікраёне Масюкоўшчына па цане 2,5 мільёна рублёў за квадратны метр.

Сталічныя ўлады ўдакладняюць, што ў далейшым «будуць прапаноўвацца іншыя варыянты вырашэння кватэрнага пытання».

Звышвыгадная прапанова — будаўніцтва за $800 за метр адшукаць амаль нерэальна — абрадавала «кінутых» дольшчыкаў, але абурыла іншых людзей. Рашэнне Мінгарвыканкама не стала саламонавым.

Меркаванні ў інтэрнэце вагаюцца ад скептычных: «Драбяза, што 50 сумленных законапаслухмяных сямей атрымаюць свае кватэры на год пазней...» да рэзкіх: «На якой падставе ім гэтыя прывілеі? Калі ў мяне ў грамадскім транспарце кашалёк выкралі, дазвольце мне цяпер бясплатна ездзіць у метро на тую суму, якую ў мяне выкралі!»

**ЯВ**

## СЦІСЛА

### Распродаж «Нафтана»

Урад Беларусі вядзе перамовы з расійскімі кампаніямі «Роснефть» і «Лукойл» аб магчымасці продажу ім пакета акцыяў ААТ «Нафтан» у абмен на стратэгічныя інвестыцыі. Інвестар павінен гарантаваць не толькі ўкладанне капіталу, але і месца рынкі збыту будучай прадукцыі і быць гатовым паставіць на прадпрыемстве сучасныя тэхналогіі.

### Чыж заваёўвае новыя прасторы

У мінскім раёне Чыжоўка адкрыўся гіпермаркет «Прастор». Гэта ўжо трэцяя гіперкрама — астатнія працуюць у Малінаўцы і Шабанах. Паведамляецца, што плошча новага гіпермаркета складае 8 тысяч квадратных метраў. «Прасторы» належаць беларускаму бізнэсоўцу Юрыю Чыжу і расійскай кампаніі «Сёмы кантынент».

### Імпарт зноў апярэдзіў экспарт

Сальда замежнага гандлю таварамі і паслугамі Беларусі ў лютым зноў стала адмоўным. Дэфіцыт склаў $285,2 млн.

### Святая вера ў $500

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў перакананы, што сярэдні заробак у Беларусі да канца 2010 года складзе $500. «У Мінэканоміцы ўу гэтым сумневаў няма»,— заявіў Снапкоў. Летась сярэдні заробак склаў $356.

**ЯВ**

# «Санта-Барбара» на «Марской зорцы»

**Беларуска—венесуэльскую нафту будуць сустракаць у Адэсе 23 красавіка.**

Танкер «Марская зорка» з 80 тысячамі тон венесуэльскай нафты для перапрацоўкі ў Беларусі выйшаў з Паўднёвай Амерыкі 2 красавіка. Паводле інфармацыі з Мазырскага НПЗ, сыравіна будзе плыць 28 дзён. Тым не менш, крыніца ў адэскім порце паведаміла журналістам, што танкер будуць сустракаць 23 красавіка ў 12.00.

Што далей? Спачатку нафта будзе перагружана з танкера ў порт. Гэта зойме 2—3 сутак. Там яе пагрузяць на чыгунку і павязуць у Мазыр. Для гэтага спатрэбіцца 25 цягнікоў — агулам 1330 вагонаў-цыстэрн.

> Для перавозкі нафты з аднаго танкера спатрэбіцца 25 цягнікоў, 1330 цыстэрн. Гэтага хопіць на тры дні працы завода.

Першая партыя нафты будзе пробнай. З яе дапамогай адпрацуюць лагістыку паставак. Першы віцэ-прэмʼер Уладзімір Сямашка ўжо прывёў свае падлікі: «Пры пэўных абставінах мы будзем зарабляць $61 на кожнай тоне».

У Беларусь будзе пастаўляцца лёгкая нафта «Санта-Барбара» з паніжаным узроўнем серы. Такая нафта цалкам задавальняе заходніх спажыўцоў паліва. Раней венесуэльскі лідэр Уга Чавес паабяцаў, што ягоная краіна ўжо ў маі будзе штодня пастаўляць у Беларусь 80 000 барэляў нафты.

**ЯВ**

# Расія і Кітай на адным полі будаваць не стануць

**Калі што, беларусы могуць звярнуцца па дапамогу ў будаўніцтве АЭС да французаў.**

Расійскі пасол у Беларусі Аляксандр Сурыкаў заявіў, што Расія можа адмовіцца ад удзелу ў будаўніцтве беларускай АЭС, калі праект будзе фінансаваць Кітай. «Мы не хочам дзяліцца з маладымі кітайскімі фірмамі. Нейкія новыя тэхналогіі трэба купляць, а кітайцы, у мяне такое адчуванне, хацелі б падгледзець, — растлумачыў ён. — Калі яны будуць удзельнічаць, то расійскі бок прапануе пераглядзець некаторыя моманты».

Адным з варыянтаў можа стаць будаўніцтва Расіяй самой АЭС, а іншым бокам — узвядзенне інфраструктуры. Цана кантрактаў пакуль не вызначаная.

Беларускі бок адрэагаваў імгненна.

«Беларусь дапускае магчымы ўдзел французскай кампаніі Areva ў будаўніцтве АЭС», — заявіў першы віцэ-прэмʼер Уладзімір Сямашка. «Ведаючы вопыт французскіх кампаній у галіне ядзернага будаўніцтва, атамных станцый, мы дапускаем магчымы ўдзел такой кампаніі, як Areva, у рэалізацыі гэтага праекта ў Беларусі. Дзверы адчыненыя».

**ЯВ**

# Дарма панікавалі?

**Расія гатова пачакаць з павелічэннем мытаў на аўтамабілі.**

Ідэя захавання нізкіх мытаў на машыны для беларусаў знайшла падтрымку там, адкуль яе не чакаў ніхто. Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў заявіў пра няпэўнасць сітуацыі: «Можа, будзем трываць некаторы час, паступова ўрэгулёўваць. Можа, часова застанецца такая сітуацыя ў Мытным саюзе, якая ёсць. Яна будзе паступова вырашацца са стварэннем уласных зборачных вытворчасцяў у Беларусі».

Паколькі з усіх аўтавытворчасцяў у нашай краіне функцыянуе толькі «Саманд» — і той выпусціў толькі 241 машыну за мінулы год, — вырашэнне пытання можа расцягнуцца на гады.

Сурыкаў прывёў і прыблізныя падлікі стратаў беларускага насельніцтва ад магчымага новаўвядзення. Яны склалі б прыблізна $200 мільёнаў.

**ЯВ**

# Справа Цыгана: І свіныя хвасты, і дзевак у сауну

Працяг са старонкі 1.

Ён не прызнаў сябе вінаватым, а даваць паказанні адмовіўся, па меншай меры, пакуль не выслухае пацярпелых і сведкаў. У першы ж дзень слуханняў адвакатка прасіла зрабіць судовы працэс закрытым, але судовая калегія вырашыла, што ў справе Цыгана няма ніякіх дзяржаўных таямніцаў, і толькі моманты з падрабязнасцямі інтымнага характару будуць разглядацца ў зачыненым рэжыме.

Абвінавачванне кажа, што чыноўнік не грэбаваў ніякімі хабарамі. Супрацоўнікі рынку перадавалі для Цыгана садавіну, гародніну, сухафрукты і нават памперсы, пэўна, для ўнучкі. Часткова тавары аплачваліся, аднак не заўсёды і не адразу. Супрацоўнікі Мінскага мясакамбіната прымалі нават «замовы» на сваю прадукцыю.

Галоўны інжынер ды дырэктар камбіната расказалі, што Цыган часцяком тэлефанаваў і замаўляў па 5—10 кілаграмаў свініны ў вёску бацькам. Паўфабрыкаты завозілі ў краму. Аднак запісвалі не на кіраўніка адміністрацыі, а на прыдуманыя прозвішчы. Кіроўца Цыгана прыязджаў у краму і забіраў. Дырэктар мясакамбіната, маўляў, думаў так: сказана завезці ў краму, значыць, у краме ўсё будзе аплачана.

## Галоўны сведка — асабісты кіроўца

Меню Цыгана складала пераважна свіное рагу, адзін раз замаўляліся нават свіныя вушы ды хвасты. Галоўны інжынер мясакамбіната Васіль Кахнюк кажа, што набываў для Цыгана ў краме кілбасы ды вяндліну за свае грошы, а потым у дыпламаце ў сваім кабінеце перадаваў усё кіроўцу Цыгана. Цыган пры сустрэчы, бывала, часткова разлічваўся. Напрыклад, вярнуў каля 200 тыс. за прадукцыю прыкладна на 450 тыс. Кахнюк упэўнены, што Цыган чалавек прыстойны, грошы аддаў бы з часам. Але нагадваць сумы было няёмка.

«Цыган у сваю чаргу, як я разумею, дапамагаў у рэалізацыі прадукцыі мясакамбіната. Без загада Цыгана ці намеснікаў крамы прадукцыю бралі ў меншых аб'ёмах», — сказаў Кахнюк.

Намеснік кіраўніка адміністрацыі Алег Манчанка ў сваіх паказаннях пярэчыў: ніякая адміністрацыя не можа прымусіць крамы набываць ці не набываць прадукцыю мясакамбіната. У нас жа рынкавыя адносіны.

Галоўны сведка з боку абвінавачання — Аляксандр Сацук, асабісты кіроўца Цыгана. Ён пацвярджае, што насамрэч яму даваліся даручэнні з'ездзіць па мяса.

Зрэшты, існуюць фотаздымкі ды тэлефонныя запісы. Перад арыштам за Цыганам ды яго кіроўцам не адзін месяц пільна сачылі.

## Запраўце мне «Мерсэдэс»

Міхаіл Цыган ездзіў на службовым «Мерсэдэсе». Ды нешта не заўсёды хапала яму бензіну. Дырэктар УП «Рэмаўтадар» Валерый Шамрук расказаў у судзе, што былі такія выпадкі, калі Цыган званіў ды расказваў, што перавысіў патрэбны ліміт паліва, прасіў дапамогі, і яны «дамаўляліся». Шамрук сцвярджае, што запраўляў «Мерсэдэс» начальніка на 5—10 літраў, маўляў, за кошт нявыкарыстанага ліміту сваёй службовай машыны, а, бывала, і за свае грошы. А 9 ліпеня перадаручыў гэтую справу майстру прадпрыемства.

Як і ў выпадку з мясакамбінатам, узнікае ўражанне, што сведкі прымяншалі аб'ёмы сваёй «дапамогі».

Паводле звестак РУП «Беларуснафта-Аргнафтахім», у той дзень па электроннай картцы аднаго з кіроўцаў «Рэмаўтадара» ў 12:37 было запраўлена 80 літраў бензіну. Дарэктар Шамрук кажа, што і не ведаў, што ажно 80 літраў. «Гэта ж трэба?!»

Дырэктар «Рэмаўтадара» ў судзе не пацвердзіў сваіх словаў з пратакола допыту, што «не мог адмовіць Цыгану, бо інакш шукаў бы новую працу». Дый уласнік той электроннай карткі, кіроўца «Рэмаўтадара», у судзе паказанні змяніў. Ужо зусім не на загад начальніка ён аддаў сваю картку і пароль з доступам да службовага бензіну. Проста яго заблытаў суровы следчы. Было ўсё даўно, і ён нічога дакладна не памятае: можа, аддаваў картку, можа, і не аддаваў, можа, знік бензін, а можа, і не.

## Бензін сцякаўся ручаінкамі

Назаўтра, пры разглядзе наступнага эпізода, карціна паўтаралася з іншымі героямі. Дырэктар ЭКУП «СокалКамунСэрвіс» не змог адмовіць кіраўніку адміністрацыі Цыгану ў просьбе і некалькі разоў цераз сваіх падначаленых перадаваў бензін па 10—20 літраў і адзін раз 80. Шляхам недавыкарыстанага ліміту і эканоміі ўсё было спісана і недастач у фінансавых падліках не здарылася.



## Чыноўнікі ў саўне

Перад разглядам наступнага эпізода адвакатка зноўку заявіла хадайніцтва закрыць судовы працэс. На яе думку, факты з інтымнага жыцця Цыгана абсалютна неабавязкова ведаць прэсе. Пракурор быў супраць, бо ў прэсе на той момант і так сфармавалася няправільнае меркаванне. Некаторыя СМІ надрукавалі, нібы пацярпелыя (намеснікі кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна) таксама парыліся ў саўне разам з дзяўчатамі ў працоўны час. Дзеля таго, каб не «няславіць ганар» невінаватых, не трэба працэс закрываць.

Судовая калегія ўзяла бок пракурора.

Сведкі ўсе як адзін пацвярджалі, што Цыган запрашаў у саўну, але ніякіх дзяўчат з імі не было. А што рабіў Цыган у саўне ў іх адсутнасць, не ведаюць, бо інтымным жыццём начальніка не цікавіліся. Сядзелі мужчынскай кампаніяй, пілі піва ці гарэлку, закусвалі, гаманілі пра жыццё. Ніхто з іх за саўну не плаціў, а хто аплачваў пасядзелкі, не задумваліся, маўляў.

Асабліва добра ўсім запомніўся дзень выбараў у 2008 годзе. Цыган запрасіў сваіх намеснікаў у саўну, як выразіўся ягоны першы намеснік, каб «падвесці вынікі выбараў». Кампанія была пачэсная. Акрамя кіраўніцтва адміністрацыі, у саўну прыехалі кандыдат у дэпутаты Раман Кораб (менавіта ён на тых выбарах атрымаў перамогу ў сваёй акрузе), а таксама прадстаўнікі пракуратуры, у прыватнасці, першы намеснік пракурора горада Мікалай Старавойтаў. Былі і асобы з МУС, а магчыма і КДБ. Відаць, гаворка пра спецгрупу, «адказную за выбары». Дакладна ўзгадаць усіх прысутных сведкі «не змаглі».

Кіроўца Сацук насамрэч пракурора гэтага ўласна на машыне прывозіў. Астатніх не бачыў, у саўне не быў, але ведае: «Яны ўсе ў той дзень у выбарах удзельнічалі, галасы падлічвалі, а потым адправіліся ў баню».

Такой палітычнай абмылкі Цыган спалохаўся і папрасіў слова. Ён патлумачыў, што ягоны кіроўца проста не разумее працэдуры выбараў і не ведае, што кажа. Ніхто ніякіх галасоў у саўне не лічыў. Сабраліся выпіць у той дзень толькі пасля таго як скончылі працу ды вярнуліся з Мінгарвыканкама, позна ўвечары. Да працэсу выбараў гэта не мела дачынення.

Суддзю больш цікавіла, за чый кошт святкавалі. Бо грошы за саўну ніхто з шаноўных гасцей не плаціў. Сведкі нават «не задумваліся», адкуль узялася закуска.

## Пальцы крыжыкам

Алег Гнядоўскі, дырэктар Спартова-аздараўляльнага комплексу НРА УП «Голтімлен», быў сябрам падсуднага. Сябравалі яны ажно з 90-х, ездзілі разам на рыбу ды паляванні.

Саўна? Саўна даходу не прыносіла, не. Часценька пуставала і кліентаў не было. Таму ён нават ключ Цыгану даваў, каб сябар мог адпачыць, папарыцца ці пасядзець са сваімі сябрамі. Цыган заўсёды папярэджваў, калі прыедзе, таму ніякім праблем ці прэтэнзій да яго няма. Карысць ад сяброўства? Не, ніякай карысці Гнядоўскі не меў, нягледзячы на тое, што ўсе яго аб'екты знаходзяцца на тэрыторыі гэтага раёна. Акрамя саўны, ён мае яшчэ краму і шапік у пераходзе.

На пытанні пракурора ён адказваў спакойна. Так, звычайна Цыган прыязджаў не ў працоўны час, увечары, прыблізна раз на тыдзень.

У 2007 годзе ў Гнядоўскага былі праблемы з падатковай. Калі закрываў ІП і рэгістраваў ПУП, яго крама працавала пэўны час без ліцэнзіі. Завялі крымінальную справу за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, штраф у 150 базавых велічыняў ён даўно выплаціў. Цыгану як сябру, здаецца, паведаміў, што меў непрыемнасці. Аднак падрабязнасцяў не расказваў і дапамогі не прасіў.

Не на радасць Гнядоўскаму пракурор пачаў зачытваць раздрукоўкі тэлефонных размоваў паміж сведкам і абвінавачаным. Алег Георгіевіч адразу счапіў пальцы крыжыкам. Расхваляваўся.

## Свята благагавення

Адна з размоваў:

**Гнядоўскі:** Там па маім пытанні ўсё пацвердзілася, мне ўжо аддалі паперы.

**Цыган:** Я ў курсе, мне ўчора ён сказаў... Усё робім. Ён мне прыйшоў сказаў, што «так»... Я яму пакінуў... М-гы... Ён трымае на кантролі.

У іншым месцы суддзя выпытвала:

— Пра якую «добрую» паперу ішла гаворка?

**Гнядоўскі:** А гэта 7 красавіка — добрае чысло. З царквы, напэўна, папера прыйшла. Прыкол такі, добрая вестка прыходзіць.

**Суддзя Гурыновіч Л.П.:** Якая вам прыйшла папера з царквы?

**Гнядоўскі:** Віншаванне са святам, напэўна.

**Суддзя, не хаваючы ўсмешкі:** З якім святам?

**Гнядоўскі:** Сёмага, здаецца, свята. Благагавення ці як яно там... Вось я і кажу, добрая вестка прыйшла.

**Суддзя:** А Цыган адкуль пра гэта ведаў?

**Гнядоўскі:** Можа быць, яму такая таксама прыйшла...

**Пракурор:** Там у размове было, што прывезлі нешта ў халадзільнік паставіць для Цыгана?

**Гнядоўскі:** Калі перафразаваць, то мелася на ўвазе, што не для Цыгана, а ад Цыгана. Я так думаю, што ён купіў і перадаў.

**Суддзя:** Вы казалі, што ў вас вышэйшая адукацыя? Вышэйшая якая?

**Гнядоўскі:** Юрыдычная.

## Пракурор з кепскай памяццю

Болей пытанняў да яго не было. Запрасілі наступнага сведку, а Гнядоўскі ўсё працягваў трымаць пальцы крыжыкам.

Чаму, стала зразумела, калі паказанні даў Віталь Ждановіч, пракурор Кастрычніцкага раёна. Ждановіч ведаў Цыгана па працы. Адзін раз нават былі разам у саўне, адзначалі дзень выбараў у 2008-м. Як дабіраўся да лазні, не памятае. Хто яшчэ там прысутнічаў, не можа сказаць за тэрмінам даўніны. Гэта было позна ўвечары, пасля таго як здалі бюлетэні ў Мінгарвыканкам. За чый кошт быў арганізаваны стол, не ведае, у расходах удзелу не прымаў.

Аднойчы падсудны Цыган звярнуўся да пракурора Ждановіча па кансультацыю ў адной крымінальнай справе.

«Міхаіл Іванавіч звярнуўся да мяне як да пракурора па пытанні, як можна дапамагчы чалавеку, на якога завялі крымінальную справу? Цыган сказаў, што ёсць такі Гнядоўскі, на якога заведзена справа, 233-і артыкул, вусна абмаляваў сітуацыю. Я, не гледзячы ў справу, сказаў, што тут не патрэбна хвалявацца, вынік зразумелы і лагічны. Па дадзеным злачынстве гэтаму чалавеку будзе штраф. Цыган запытаў, можа быць патрэбна звярнуцца ў суд, да старшыні суда. Я адказаў, што нікога не патрэбна прасіць і не трэба хвалявацца».

Суддзя: А чаму вы з такой упэўненасцю сказалі яму, што будзе штраф?

Ждановіч: Бо ў нас у бюджэце праблемы. Таму будзе штраф, патрэбна папаўняць бюджэт.

На пытанне суддзі, ці пазнае Ждановіч Гнядоўскага, Ждановіч адказаў «не». Гнядоўскі таксама не пазнаваў. І працягваў трымаць пальцы крыжыкам.

Справа Цыгана разглядаецца ў абласным судзе штодзень, але доўжыцца яна будзе яшчэ не адзін месяц. Пасля таго як генеральны пракурор Рыгор Васілевіч у жніўні 2009-га завёў крымінальную справу па матэрыялах МУС, ды паўгода ішло следства, у суд выкліканы ўжо болей за 100 сведкаў. Яны тлумачаць тыя ці іншыя эпізоды, а таксама працоўныя абавязкі і магчымасці Цыгана.

Карціна з жыцця тыповага раёна становіцца яснай.

**Настасся Шамрэй**

радыё свабода

Тэл. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь

ад 28 сакавіка – новыя частоты, хвалі

| | | |
|---|---|---|
| 06:00–08:00 | 6105 кГц | 49 м |
| | 6120 кГц | 49 м |
| 18:00–20:00 | 7270 кГц | 41 м |
| | 9725 кГц | 31 м |
| 20:00–22:00 | 6050 кГц | 49 м |
| | 6105 кГц | 49 м |
| 22:00–24:00 | 5995 кГц | 49 м |
| | 9405 кГц | 31 м |

612 кГц 490 м сярэднія хвалі

www.svaboda.org

# Акадэмія МУС: Курсант Бяляк быў адлічаны за самаволку і хуліганства

Рэдакцыя «НН» атрымала адказ на запыт у прэс-службу Акадэміі МУС з нагоды ліста былога курсанта міліцыі Дзяніса Беляка з Наваградка.

Калі рыхтаваўся артыкул пра Дзяніса Беляка, былога курсанта Акадэміі МУС, адлічанага з вучобы за інцыдэнт у родным Наваградку, журналіст «НН» звярнуўся ў Акадэмію па каментары. Адказ з прэс-службы прыйшоў пасля публікацыі артыкула «Нам у міліцыі такія не патрэбныя, якія ідуць супраць сваіх» (№13 ад 1 красавіка). Вось што ў ім гаворыцца: «Загадам Акадэміі МУС ад 07.10.2009 №157л/с, на падставе заключэння Акадэміі МУС ад 06.10.2009, курсант следча-экспертнага факультэта Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь радавы міліцыі Бяляк Дзяніс Мікалаевіч за грубае парушэнне службовай дысцыпліны, якое выявілася ў самавольным выездзе за межы Мінскага гарнізона і здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага арт. 17.1 (дробнае хуліганства) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь, адлічаны з Акадэміі МУС і, у адпаведнасці з Палажэннем аб праходжанні службы ў органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, звольнены ў запас Узброеных Сіл па п.154.15 (у сувязі са здзяйсненнем правіннасцяў, што дыскрэдытуюць званне супрацоўніка органаў унутраных спраў)».

Сам Дзяніс кажа, што меў падпісаны начальнікам дазвол на сутачнае звальненне. Пры гэтым ён прызнае, што пра ад'езд у Наваградак (за межы гарнізона) ён нікога не папярэдзіў. Хлопец цвердзіць, што ў акадэміі ёсць правіла: па першым выкліку са звальнення неабходна з'явіцца ў акадэмію не пазней, чым праз тры гадзіны. «З Наваградка ў Мінск я ў любым выпадку патрапіў бы за тры гадзіны, таму нікога і не папярэджваў», — тлумачыць Д.Бяляк.

**Сямён Печанко**

## ЗДАРЭННІ

### Школьнік-інвалід скокнуў з 9-га паверха

17-гадовы вучань 11 класа, інвалід першай групы, збіраўся ў школу. Але, выйшаўшы з кватэры, ён узняўся на лесвічны пралёт 9-га паверха свайго дома і скокнуў з акна. Матывы... Можна пра іх здагадацца.

### У Сожы патануў браканьер

Двое мужчынаў рыбачылі ў Навабеліцкім раёне Гомеля на гумавай лодцы, хаця лавіць рыбу зараз забаронена — нераст. Каля другой гадзіны ночы выявілася, што лодка праколатая. Адзін з браканьераў, які не ўмеў плаваць, каб не патануць, павіс на дрэве, а яго таварыш адправіўся па дапамогу. Праз тры гадзіны рыбак вярнуўся, але сябра на дрэве ўжо не было. Глыбіня ў гэтым месцы складае каля двух метраў.

### Засіліўся праз каханне

Скончылася праверка па факце самагубства замежнага студэнта, які вучыўся ў Медуніверсітэце. Як выявілася, 21-гадовы хлопец засіліўся ад кахання да дзяўчыны, якая засталася на радзіме, у Сірыі, і з якой ён разышоўся незадоўга да ад'езду ў Беларусь. Пра гэта студэнт напісаў у перадсмяротным лісце.

### У Гомелі загарэўся джып

Аўтамабіль «Міцубісі Паджэра Спорт» загарэўся з сярэдзіны. Салон джыпа 2008 года выпуску згарэў поўнасцю. Цана машыны складае 40 тыс. даляраў. Прычынай пажару стала кароткае замыканне электраправодкі. Шкода ацэньваецца ў 5 млн рублёў.

### Інсцэнаваў самагубства бацькі

Цела 62-гадовага мужчыны было знойдзена ў яго кватэры ў Талачыне — яно вісела ў пятлі. Але аператыўнікі высветлілі, што насамрэч чалавека задушыў яго ўласны сын падчас сваркі. Акт суіцыда бацькі 30-гадовы жыхар райцэнтра інсцэнаваў.

### Інжынер «Белшыны» затрыманы за распаўсюд дзіцячага порна

Затрыманаму інкрымінуецца, што ён распаўсюджваў у інтэрнэце парнаграфічныя матэрыялы з выявай непаўналетніх. Заўважым, што гаворка ідзе не пра маладога чалавека, а пра 57-гадовага чалавека, амаль пенсіянера, якога добра ведалі і паважалі як суседзі, так і калегі на прадпрыемстве. У дачыненні да інжынера заведзена крымінальная справа, якая прадугледжвае да 8 гадоў турмы. Следчыя высвятляюць, адкуль інжынер браў тыя порнаматэрыялы.

### Забіў чатырох страусаў

У Кобрынскім раёне на страусавай ферме, непадалёк ад вёскі Козішча, вартаўнік забіў палкай чатырох птушак. 30-гадовы мужчына падчас дзяжурства абыходзіў тэрыторыю і ўбачыў, што адна птушка выйшла з загона. 40 хвілін ён заганяў страуса. Пасля чаго зайшоў у загон і стаў збіваць палкай птушак. У выніку чатыры страусы загінулі. Работнікам фермы вартаўнік заявіў, што адбыўся паморак. Устаноўлена, што вартаўнік быў п'яны ў дуба.

**СМ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Штанга вагой 161 кг вырвалася з рук беларускага цяжкаатлета Генадзя Махвяені падчас Чэмпіянату Еўропы ў Мінску. Спартсмен збіраўся падняць цяжар амаль у 2, 5 разу большы за ўласны — вагавая катэгорыя Генадзя — да 62 кг. Ён быў траўмаваны.**

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Сарцір наносіць удар у адказ

**Пане Рэдактару, я абураны «НН» № 13.** Замест таго каб тэрактам у Белакаменнай даць загаловак «The loo strikes back»/ Сарцір наносіць удар у адказ», вы надрукавалі спачувальныя артыкулы ды развагі чаму ды што.

Тэракты з Ірака, Афганістана ды Пакістана штодня можна бачыць па талерцы, так што маскоўскі — не prime news. Наадварот, трэ было падкрэсліць лагічнасць гэтай з'явы і падпужаць той 41% дурняў з Беларусі, што прагнуць «саюза» і халяўнай нафты, плявузгаюць пра «адзінакавую кроў» ды вярзуць іншую несусветную агітпропаўскую лухту. Яны забыліся пра савецкі гандаль з «нагрузкай». А нагрузка можа быць жахлівай.

Вы ні словам — ні бедным — не расказалі пра злачынствы расійцаў на Каўказе з маўклівай згоды мюнхенаўцаў з Захаду. Пра чорных удоў тэж не пішаце.

Уся расійская шчыкавіна скрайне драпежна-імперыялістычная, так і трэ было напісаць. Зюганаў прагне смяротнай кары і кроўнай помсты (караць родзічаў тэрарыстаў). «Мы не можам пакінуць Каўказ, там унікальныя здраўніцы». Кагэбісцік Мядзведзеў супраць пакарання смерцю, але «ніхто не павінен застацца жывым». А праўда ў тым, што аніякія ахоўныя меры не зашкодзяць людзям з Каўказа наносіць удары па ўсёй тэрыторыі імперыі.

**Мікалай Бусел, народны вясковы чытака (Дуброва, Светлагорскі раён)**

### Як Макей нас не прыняў

**У канцы сакавіка вялікая група грамадзянаў зноў сабралася на асабістым прыёме старшыні Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея.** Але начальнік галоўнага ўпраўлення па працы са зваротамі грамадзянаў і юрыдычных асобаў кожнаму з нас накіраваў чарговую адпіску з адмовай у асабістым прыёме па папярэднім запісе. Ніводны (!) заяўнік з прысутных не быў дапушчаны да высокага саноўніка.

Сам прыём без тлумачэнняў быў перанесены з 9.00 на 15.00. Народ не разыходзіўся. Прысутныя вырашылі высветліць, хто ж гэтыя 4 шчаслíўчыкі, дапушчаныя да аўдыенцыі, чые прозвішчы былі ўказаныя на дошцы аб'яваў. Ніхто з нас іх не ведаў, хаця ўсе даўно перазнаёміліся адзін з адным на такіх пасядзелках.

Як стала вядома пазней, адзін з тых прынятых, напрыклад, патрабаваў вярнуць танку, што стаіць на пастаменце ля Дома афіцэраў, колішнюю шыльдачку «За родину! За Сталина!», якую былі прыбралі. З чаго вынікае, што ў нашага кіраўніцтва свае прыярытэты. Яго неяк не хвалююць такія «дробязі», як неабходнасць трымацца Канстытуцыі краіны, парушэнне правоў і свабодаў чалавека, неналежнае выкананне законаў судамі і пракуратурай, непрафесіяналізм экспертаў і г.д. А менавіта з такімі праблемамі прыйшлі на прыём усе непрынятыя грамадзяне.

Згодна з дырэктывай №2 кіраўніка дзяржавы ад 27 снежня 2006 года «Аб мерах далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату», «...лічыць стан працы з грамадзянамі адным з асноўных крытэраў ацэнкі дзейнасці дзяржаўных органаў». Пад асаблівы статус пападаюць калектыўныя звароты 30 і больш грамадзянаў. Што мы і маем у нашым выпадку.

Вось з такім выкананнем згаданай дырэктывы мы сутыкнуліся ў Адміністрацыі яе аўтара. Прысутныя адлюстравалі такі «цёплы» прыём у кнізе заўвагаў і прапановаў. У тым, ці будзе выкананы яшчэ адзін пункт гэтай цудоўнай дырэктывы, глыбока сумняваюся. У ім сказана: «Па кожным выпадку фармалізму... і непавагі да людзей праводзіць праверку і ў выпадку пацверджання адпаведных фактаў прыцягваць вінаватых да адказнасці аж да вызвалення ад займанай пасады».

**Тамара Гулезава, Мінск**

### Вярніце ўклады па-добраму

**Раней нас вучылі: грошай скора зусім на цэлым свеце не будзе!** Пры камунізме ўсім жыцца будзе вельмі добра: ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па яго патрэбах! Вучылі маё пакаленне працаваць за «дзякуй». Чаго толькі не прыдумвалі, каб не плаціць варты чалавека заробак.

Цвёрдая «валюта» сённяшняга дня — дывідэнды на акцыі заводаў і фабрык, якія атрымаў ці купіў грамадзянін за чэкі «Маёмасць»! Чакай, скора яны (акцыі) будуць вельмі дарагімі! Навошта табе гэтыя дробныя дывідэнды за іх!? Вось лепш прадасі іх апасля, як будзе высокая цана на іх — адразу станеш багацеем! Чакай. Прыкладна такім чынам трымаюць працоўны народ чыноўнікі ў летаргічным сне.

Раней казалі: ашчадны банк СССР — надзейны схрон для тваіх зберажэнняў! Людзі верылі дзяржаве. Усе грошыкі, якія былі ў народа беларускага, што збіраліся дзесяцігоддзямі, — выграблі да капейкі. А ні ў аднаго чынушы нават волас з галавы не ўпаў. «Ніхто не вінаваты, што вялікая дзяржава СССР развалілася, як картачны домік!» — апраўдваліся чыноўнікі. Як гэта ніхто? А вы, чыноўнікі? Вы ж кіравалі ўсім гэтым працэсам!

Гэтакае становішча ўлады-падманшчыцы трэба неяк паціху выпраўляць, рэабілітоўвацца. Увесь свет разумее, што ўлада КПСС як быццам памерла, але хто можа паказаць месца, дзе яна пахавана?

Можа, лепей давайце так зробім: аддайце, дарагія нашы чыноўнікі, народу тыя грошы, што ВЫ ўкралі ў народа, а далей і перастрайвайце апарат, абнаўляйце, збаўляйцеся ад карупцыі... Аддайце нарабаванае па-харошаму. А далей — кіруйце! Абкрадайце нас непрыкметна для нас. Усе просім, каб непрыкметна абкрадвалі сваіх грамадзян! Павышайце сваю кваліфікацыю, паважаныя чыноўнікі. Вельмі вас усе просім!

**Завінскі дзядзька**

## ФЕЛЬЕТОН

### Чым вазіць ад Чавеса нафту, лепей завезці яму нафтаперапрацоўчыя заводы

Ліст групы таварышаў у адпаведныя органы.

Што за людзі? Іншыя б толькі радаваліся, а гэтым нефармалам як костка ў горле нашы поспехі на міжнароднай прасторы. Самі ж потым будуць запраўляць свае джыпы венесуэльскім палівам. А цяпер яны лямантуюць: рэнтабельнасць прапанаванай схемы дастаўкі нафты выклікае вялікі сумнеў у спецыялістаў. Не, каб цярпліва дачакацца мая і з усім народам радасна вітаць першыя танкеры з таннай нафтай!

Так і пнуцца яны абразіць сваімі недарэчнымі заўвагамі нашы дасягненні ў свеце. «Адлегласць далёкая, нафта цяжкая, а месца ў акіяне ўсім не хопіць», — чуецца іх лямант.

Мы, група таварышаў, лічым, што дастаўка нафты з Венесуэлы танкерамі, а затым па чыгунцы да НПЗ як альтэрнатыўны варыянт расійскаму паліву — ход правільны, але не да канца прадуманы. Калі што не выйдзе — толькі лішні козыр у рукі нашым зласліўцам ды расійскім алігархам.

Прапануем наадварот! Нашыя нафтаперапрацоўчыя заводы дэмантаваць, пагрузіць на платформы і затым морам-акіянам завезці ў Венесуэлу. Во гэта будзе прарыў дык прарыў на міжнароднай арэне. Амерыканцы першыя ў чарзе за танным бензінам стаяць будуць, а астатнія зайздроснікі задушацца.

Што-што, а вопыт мы маем. У вайну ўсю прамысловасць за Урал эвакуявалі, а тут нейкія два НПЗ. А потым, калі ўсю нафту з Венесуэлы выкачаем, — вернем заводы назад. Як-ніяк яны — усенародны здабытак.

А калі праект затармозіцца, звяртайцеся да нас. Мы, старыя чэкісты, у свой час нават рэкі назад кульнулі.

Спадзяёмся на ўважлівы падыход да разгляду нашай прапановы, — магчыма, за ёй светлае будучае краіны. А то мы тут са сваёй ідэяй падышлі да адных, дык яны нам параілі звярнуцца ў фантастычны часопіс. Вам, кажуць, дзядулі, менавіта туды і трэба. Напэўна, таксама ворагі Радзімы?

**Чытаў таварыш Жураўскі, Горадня**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

# Расія блаславіла сілавы захоп улады ў краіне СНД

Працяг са старонкі 3.

Бакіеў уначы з аўторка на сераду арыштаваў шэраг лідэраў апазіцыі, у тым ліку былых спікераў парламента і міністраў. Усё ж лавіны пратэсту не стрымаў. Наадварот, яна аказалася анархічнай і некіраванай. Натхнёныя поспехам у Таласе, выступы апазіцыі пачаліся і ў іншых гарадах краіны, у тым ліку ў Бішкеку.

На вуліцы сталіцы першапачаткова выйшла ўсяго каля 10 тысяч чалавек, але радыкальна настроеных. Пераважна людзі прыехалі з райцэнтраў і вёсак. Яны спрабавалі прайсці ад офіса апазіцыйнай сацыял-дэмакратычнай партыі на цэнтральную плошчу, але міліцыя перагарадзіла дарогу, ужываючы шумавыя гранаты і дубінкі. Пралілася першая кроў. Тады тлум атакаваў і раззброіў мясцовы АМОН. І рушыў далей на Адміністрацыю прэзідэнта. Калі шматтысячны раз'ятраны натоўп стаў прабіваць грузавіком жалезную агароджу Дома ўрада, у Бакіева не вытрымалі нервы. У натоўп пачалі страляць снайперы. Цяпер Бакіеў, што схаваўся ў родавым ауле, сцвярджае, што першымі пачалі страляць маніфестанты, і ахова прэзідэнта вымушана адстрэльвалася. «Я даваў каманду страляць па тых, хто мае зброю», — прызнаўся Бакіеў. Відаць, ён не спадзяваўся на здольнасць спецназа разагнаць натоўп сценка на сценку і баяўся ўзброенай апазіцыі. Як бы тое ні было, але перад брамай палаца паляглі восем дзясяткаў дэманстрантаў, а ахвяраў сярод аховы не было. Сотні людзей былі параненыя.

Гэтая бойня зрабіла сітуацыю некіраванай. Зайграла жаданне помсты. Маніфестанты таксама дасталі зброю, якая, відаць, была ў іх напагатове. Групы дэманстрантаў захапілі тэлецэнтр, пракуратуру. У Таласе быў захоплены і жорстка збіты міністр унутраных справаў Малдамуса Канганціеў.

Будынак Адміністрацыі прэзідэнта ўзялі штурмам, як толькі стала вядома пра адлёт Бакіева са сталіцы, хоць часовы ўрад і заклікаў гэтага не рабіць. Імаверна, Бакіеў проста перапалохаўся. А ахова абараняла прэзідэнтуру, пакуль там заставаўся прэзідэнт, а пасля пераапранулася ў штацкае і сышла дварамі пад покрывам ночы. Парламент заставаўся ці не адзіным спакойным месцам у горадзе.

Вечарам Роза Атунбаева абвясціла, што ўлада цалкам перайшла ў рукі апазіцыі. Агулам у сутычках дэманстрантаў з сілавікамі былі забіты 81 чалавек, больш за 500 шпіталізаваныя. На гэты раз пераварот у Кыргызстане атрымаўся нашмат больш крывавы, чым пяць гадоў назад.

У ноч на 8 красавіка па ўсім Бішкеку пракацілася хваля марадзёрства. Былі абрабаваныя найбуйнейшыя крамы, гандлёвыя цэнтры, музеі. Міліцыя баялася высунуцца. Марадзёраў атрымалася больш-менш прыструніць толькі праз суткі.

Падчас тэлефоннай размовы Розы Атунбаевай з прэм'ер-міністрам Расіі Уладзімірам Пуціным было сказана, што Расія гатовая аказаць матэрыяльную дапамогу Кыргызстану ў сувязі з «асаблівым характарам адносінаў». Адміністрацыя Мядзведзева выказала афіцыйную незадаволенасць палітыкай дзейснай кіргізскай улады.

Прэзідэнт Бакіеў усё яшчэ не пакінуў тэрыторыю Кыргызстана, у панядзелак ён правёў на поўдні краіны мітынг сваіх прыхільнікаў. Разам з тым Роза Атунбаева кажа, што гарантаваць бяспеку Бакіева яны не ў стане. Пасольства ЗША адмаўляе звесткі, што іхняя краіна прадставіць Бакіеву палітычны прытулак.

Кыргызстан ці не адзіная постсавецкая краіна, дзе змена ўлады ўжо паўторна адбываецца гвалтоўна. У Прыбалтыцы і Малдове ўлада заўсёды перадавалася дэмакратычным шляхам. Ва Украіне перамагла аксамітная, бяскроўная рэвалюцыя. Падзеі ў Кыргызстане даказалі, што адносна невялікая група людзей, якая прагне ўлады, можа гэтага дабіцца. Сцэнар падзей нагадваў захоп улады Эдуардам Шэварднадзэ ў Грузіі ў 1992 годзе. Тады таксама за пераваротам стаяла Масква.

Беларусь амаль ніяк не зрэагавала на падзеі ў Кыргызстане. З каментаром выступіў толькі прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных, які заклікаў бакі адмовіцца ад гвалту і «аднавіць палітычную стабільнасць». Хоць дэ-факта ў краіне СНД улада змянілася неканстытуцыйным чынам, нават без выбараў, што само сабою стварае небяспечны прэцэдэнт. Прынамсі, для рэжыма Аляксандра Лукашэнкі.

Між тым Расія дапамагла рыхтаваць пераварот, прынамсі, антыбакіеўскай кампаніяй на расійскіх тэлеканалах. Новы кіргізскі віцэ-прэм'ер нават паспяшаўся заявіць пра «новую палітыку Расіі ў дачыненні да СНД». Раней, ад Кебіча да Януковіча, Масква аддавала перавагу падтрымцы старых коней, якімі б яны ні былі. Бакіеў і расійскую базу дазволіў, і з Мытным саюзам фліртаваў. Тым не менш, Масква вітала яго адхіленне. Праз некалькі гадзін пасля крывавых падзей у Бішкеку Пуцін падвёў пад гэты ўдзел ідэалагічную аснову: «Калі прэзідэнт Бакіеў прыходзіў да ўлады, ён вельмі жорстка крытыкаваў адхіленага прэзідэнта Акаева за сямейнасць, за тое, што ў эканоміцы Кыргызстана кругом сядзелі сваякі. У мяне такое ўражанне, што спадар Бакіеў наступае на тыя самыя граблі».

**Зміцер Панкавец**



# Сяргей Богдан: Кыргызстан, як Конга

Гутарка пра падзеі ў Кыргызстане з усходазнаўцам **Сяргеем Богданам**.

**«Наша Ніва»: Чаму пяць гадоў назад і сёння мы назіраем практычна аднолькавыя сітуацыі на вуліцах Бішкека?**

**Сяргей Богдан:** Мы будзем назіраць падобнае і пазней. Усё гэта звязана са слабасцю кіргізскай дзяржавы. Тое, што мы бачым сёння ў Бішкеку, укладваецца ў сцэнары развіцця краін чорнай Афрыкі. Калі сыходзіць каланізатар, палітыка якога была заснаваная на гвалце, разам з ім сыходзіць і стабільнасць. Кыргызстан з усіх сярэднеазіяцкіх краін быў найменш падрыхтаваны для функцыянавання мадэрновай дзяржавы. У Кыргызстане адсутнічае якая б то ні была іерархічная структура ўлады. Мясцовае насельніцтва да савецкага часу існавала ў племянным стане. У кіргізаў ніколі не было свайго хана ці нейкага вярхоўнага правадыра. Як вынік усё гэтай нецэнтралізаванасці дзяржавы — частыя племянныя войны.

**«НН»: Чаму Кыргызстан з'яўляецца самай русіфікаванай дзяржавай Сярэдняй Азіі?**

**СБ:** Яны папросту не былі падрыхтаванымі да прыходу квазізаходняй імперскай культуры, што ішла з Расіі. Узбекі супраціўляліся. Нават казахі пасля пэўных паразаў змаглі мадэрнізавацца. Для мяне тут пэўным прыкладам ёсць кіргізскі пісьменнік Чынгіз Айтматаў, якога можна лічыць узорам русіфікацыі. Ён напісаў цудоўныя творы, але адначасова так і не ўзняў праблему русіфікацыі Кыргызстана. Напрыклад, у казахаў ёсць Алжас Сулейменаў, які паставіў гэтыя пытанні ў кнізе «Аз і Я».

**«НН»: Разам з тым, Кыргызстан з'яўляецца самай дэмакратычнай краінай рэгіёна. Чаму?**

**СБ:** Кыргызстан быў самым дэмакратычным таму, што гэта самая слабая дзяржава ў Сярэдняй Азіі. Тэрмін failed state («дзяржава, што не адбылася») можна ўжываць і ў дачыненні да Кыргызстана. У найбліжэйшы час ён можа стаць рэгіёнам палітычнай і эканамічнай нестабільнасці, злачыннасці, галечы.

**«НН»: Гвалтоўны захоп улады наколькі характэрны для цэнтральнаазіяцкага рэгіёна?**

**СБ:** Зусім нехарактэрны. У Туркменістане ўжылі пераварот унутры рэжыму, у часты эліты. Ва Узбекістане дамінуюць рэлігійныя матывы процістаяння. Таджыкістан — клянава-рэлігійны. У Кыргызстане ў нейкай ступені можна гаварыць пра вяртанне трайбалізму — міжплемянной варожасці.

**«НН»: Супрацьстаянне поўначы і поўдня сапраўды так актуальнае для Кыргызстана, ці гэта надуманае СМІ?**

**СБ:** Там няма кансалідацыі нацыі, няма лаяльнасці да дзяржавы. Мне Бішкек чужы — і я яго рабую. Людзі не мысляць катэгорыямі нацыі. Яны мысляць катэгорыямі племя, клана, сям'і. Дарэчы, ва ўсёй Цэнтральнай Азіі можна пачуць праклёны ў бок Сталіна за адвольна праведзеныя межы паміж дзяржавамі. Таму і між краінамі існуе напружанасць. У Беларусі і Украіны таксама ёсць пэўныя пытанні па мяжы, але нашы краіны дастаткова давяраюць адна адной, каб не ўсталёўваць міны на граніцы. А Узбекістан і Кыргызстан — не. Патэнцыйна гэта можа быць вельмі небяспечны рэгіён свету.

**«НН»: Якую ролю ў кіргізскім грамадстве адыгрывае іслам?**

**СБ:** Найменшую ў Цэнтральнай Азіі. Іслам ёсць толькі намінальным веравызнаннем кіргізаў, але не з'яўляецца якім-небудзь вызначальным палітычным чыннікам, чаго не скажаш пра Узбекістан і Таджыкістан. Рэлігія — гэта першы крок, які разбурае племянную ідэнтычнасць. Другім крокам ёсць мадэрнізацыя.

**«НН»: Наколькі важны ў Кыргызстане чыннік Расіі?**

**СБ:** Вельмі важны. Гэта тая вонкавая сіла, якая можа быць зацікаўленая ў структурных пераўтварэннях кіргізскай дзяржавы. Ёсць яшчэ Кітай, але ён хутчэй дзейнічае там у эканамічнай сферы. У Кыргызстане самыя моцныя прарасійскія пазіцыі. Суседзі заўсёды закідвалі кіргізам гэта. Расійскія ўлады зацікаўленыя ў стварэнні ў Кыргызстане надзейнага плацдарма ў Азіі. Таму ў інтарэсах Расіі ўсталяванне ў Бішкеку больш-менш стабільнага рэжыму. Людзі, якія прыйшлі ў 2005 годзе на месца каманды Акаева, часта мелі досыць крымінальныя ўхваткі. Той жа Бакіеў спакойна мог размаўляць на фені. Урад Бакіева проста хацеў зарабіць, ухапіць грошай. Таму яму спакойна ўдавалася дамаўляцца і з амерыканцамі. Напэўна, для Расіі гэта быў не самы лепшы варыянт.

**«НН»: Які лёс можа чакаць Кыргызстан бліжэйшым часам?**

**СБ:** Нестабільнасць і аслабленне дзяржавы. Тут шмат што будзе залежыць ад вонкавага фактару. Ці будзе выгадна ўкладваць у Кыргызстан рэсурсы, ці апраўдае мэта сродкі? Думаю, рэсурсы будуць недастаткова вялікія, каб забяспечыць нармальнае функцыянаванне дзяржавы, каб дзеці элементарна хадзілі ў школу. Фактычна, Кыргызстан стаў першым failed state на тэрыторыі былога СССР. Шмат хто думаў, што ім стане Таджыкістан. Але, дзякуючы моцнай нацыянальнай ідэнтычнасці таджыкаў, дзяржава працягвае функцыянаваць, нягледзячы на татальную галечу. Не факт, што ў Кыргызстане так будзе заўсёды. Але хто ведае, калі структурныя перамены могуць прыйсці ў Рэспубліку Конга? Тое ж і з Кыргызстанам.

**Гутарыў ЗП**



**Сяргей Богдан**

Нар. у 1982 у Маладзечне. Скончыў факультэт міжнародных дачыненняў БДУ (2004) па спецыяльнасці «Міжнародныя дачыненні, персідская і японская мовы». Вучыўся ва ўніверсітэце Алямэе Табатабаі (Тэгеран), дзе вывучаў персідскую мову і класічную літаратуру. Скончыў магістратуру ЕГУ. Палітолаг, усходазнаўца.

КАМЕНТАР

## Мы ідзём другім пуцём

СМІ дыктатараў ад Мінска да Алма-Аты ахвотна паказваюць нехарошыя наступствы перавароту ў Бішкеку: спаленыя крамы і разрабаваны прэзідэнцкі палац. Яны пры гэтым забываюцца сказаць, што пацярпелі сеткі, што належалі клану (экс-?) прэзідэнта Бакіева. Змаганне за ўладу ў нізкаразвітых краінах не робіцца ў белых пальчатках. У Кіргізіі свае традыцыі. Гэта горная нацыя, з вялікімі традыцыямі самакіравання, але і самасудоў. Рабіць пераварот з'ехаліся насельнікі райцэнтраў і вёсак, і перш чым паехаць дахаты, яны прагнулі помсты за забітых сяброў.

Што да Азіі і даўнейшай Еўропы, то многія рэвалюцыі і перавароты суправаджаліся беспарадкамі і марадзёрствам. Вельмі часта іх правакуюць старыя рэжымы, каб апраўдаць «навядзенне парадку» і захаванне ўлады. Так было, напрыклад, у Інданэзіі ў 1998 годзе, калі сваякі дыктатара Сухарта інспіравалі марадзёрствы і пагромы, пераважна супраць кітайскіх гандляроў, у якіх загінулі 1500 чалавек і згарэла 9000 дамоў.

Дарма шукаць паралелі з Беларуссю. Беларусь не Кіргізія. Мы не горная і не мусульманская і не бедная нацыя. Палітычныя трансфармацыі ў Мінску будуць адбывацца інакш — сцэнары аксамітных рэвалюцый (Чэхія, Балгарыя, Украіна), кантракта эліт (Польшча, Літва) ці хаатычнага, але не пагромнага скідання маразматычнага рэжыму (Румынія) застаюцца больш імавернымі.

**Барыс Тумар**

# Неабвешчаная жалоба

**Адна толькі Беларусь абмежавалася спачуваннямі.**

«Смуткуем разам з вамі» — свет выказвае спачуванні польскаму народу. Беларусы таксама працягваюць прыносіць кветкі і свечкі да польскай амбасады ў Мінску.

Жалоба ў знак салідарнасці абвешчаная ў Еўрасаюзе, Украіне, Сербіі, Расіі. Трохдзённую тугу абвесціла Літва і далёкая Бразілія. У дзень пахавання жалоба будзе абавязваць у Славаччыне і Чэхіі, Латвіі і Эстоніі. У самой Польшчы абвешчаная тыднёвая жалоба.

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч асабіста пакінуў спачувальны запіс у мемарыяльнай кнізе ў польскім пасольстве ў сваёй краіне. Як і прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў. 12 красавіка, па рашэнні Мядзведзева, Расія смуткавала. Хоць адносіны Расіі з Качынскім нельга назваць сяброўскімі, кіраўнікі краіны ўсталі над старымі крыўдамі.

Рэакцыя ўладаў Беларусі была нашмат больш стрыманай, калі не сказаць — халоднай. Паведамленне пра тое, што кіраўнік Беларусі выказаў спачуванне ахвярам катастрофы і Б.Камароўскаму, якога лукашэнкаўскае інфармагенцтва назвала «маршалам», з'явілася з прыпазненнем, толькі каля 17-й гадзіны 10 красавіка. Жалобы ў Беларусі на афіцыйным узроўні не абвяшчалі. Да такой ступені, што падчас паказу па тэлеканале «Расія» фільма «Катынь» на «РТР-Беларусь» яго перакрылі шоу «Танцы з зоркамі». Хоць функцыянальна беларуская дзяржава дапамагала сваякам ахвяраў катастрофы, мінімізуючы для іх памежныя працэдуры.

Паводзіны Аляксандра Лукашэнкі нагадалі 2003 год, смерць Васіля Быкава.

Затое на трагедыю палякаў — загінуў цвет польскай нацыі — спагадна адгукнулася грамадства. Сотні людзей наведалі пасольства і консульствы Польшчы ў Мінску, Гродне, Брэсце. У Кафедральным касцёле ля алтара выставілі партрэт прэзідэнта Качынскага. У нядзелю мітр. Тадэвуш Кандрусевіч адправіў памінальную імшу па ахвярах. На ёй прысутнічалі пасол Польшчы ў Беларусі і намеснік міністра замежных справаў Беларусі Валер Варанецкі.

Адсутнасць выразнага жэсту спачування выклікала горыч і нараканні сярод часткі грамадзянаў Беларусі. Многія інтэрнаўты выказваюць расчараванне на форумах. Некаторыя асобы, як брэсцкая архітэктар і гісторык Ірына Лаўроўская, скіравалі адкрытыя лісты ў Адміністрацыю прэзідэнта.

Ужо ўвечары ў дзень катастрофы каля амбасады пабывалі некалькі соцень чалавек. Сярод першых прыехала група моладзі на роварах — актывісты веласіпеднага руху. Ля ўваходу з'явіліся кветкі, плакаты са словамі спачування, знічы. Прыйшлі вядомыя людзі — палітыкі, гісторыкі, артысты. «Колькі тут свечак!» — выгукнула пры карэспандэнту «НН» маленькая дзяўчынка. Многія прыйшлі з малымі дзецьмі. Адзін за адным, нетаропка, людзі ішлі ў амбасаду, на другі паверх, пакінуць запісы ў мемарыяльнай кнізе. Ціха казалі спачувальныя словы супрацоўнікам ў строгіх гарнітурах. Не было ніякіх праверак на ўваходзе, у дзень жалобы ніхто не прасіў наведнікаў выключаць тэлефоны і паказваць пашпарты.

...Калі сонца сядала, высока над галовамі людзей з сумным крыкам праляцеў клін гусей.

**Сяргей Мікулевіч, Сямён Печанко**



**Чорным вылучаныя краіны, што абвясцілі жалобу ў сувязі з польскай трагедыяй.**

**Лукашэнка выказаў спачуванні**

«Вялізнае гора абрынулася на блізкую нам дзяржаву, з якой Беларусь звязваюць даўнія сваяцкія, гістарычныя і культурныя адносіны. Пачуццё глыбокага смутку па прэзідэнту і грамадзянах Рэспублікі Польшча, што трагічна загінулі ў авіякатастрофе, ахапіла нашы сэрцы, — гаворыцца ў спачуванні. — Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь і ўвесь беларускі народ выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім загінулых, а таксама польскім уладам».

**Мілінкевіч заклікае ўлады абвесціць жалобу**

«Нашы суседзі, палякі, перажываюць вялікую трагедыю. У авіякатастрофе загінулі лепшыя прадстаўнікі палітычнай, вайсковай, інтэлектуальнай і грамадскай эліты краіны на чале з прэзідэнтам Лехам Качынскім. Усе суседзі Польшчы, у тым ліку Расія і Украіна, абвесцілі нацыянальную жалобу ў сувязі з гэтым.

Па ўсіх нормах чалавечнасці і добрасуседства Беларусь павінна далучыцца да жалобы.

Заклікаю беларусаў добрай волі прадэманстраваць польскаму народу свае спачуванні і спагаду.

Заклікаю беларускія ўлады аб'явіць дзень агульнанацыянальнай жалобы ў знак салідарнасці з польскім народам і ўсёй Еўропай», — піша лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч у сваім звароце.

**Сяргей Гезгала**

## Маскевіч: «Прэзідэнт прымае гэтыя рашэнні»

**На думку старшыні пастаяннай камісіі па замежных справаў і сувязях з СНД палаты прадстаўнікоў Сяргея Маскевіча, жалоба на афіцыйным узроўні не абвешчаная, бо у Беларусі — доўгія выходныя, Радаўніца і ўсе установы ўключна з Адміністрацыяй прэзідэнта не працуюць.**

Сам Сяргей Маскевіч адзначае, што з боку беларускага парламента і паасобных дэпутатаў былі накіраваныя ў Польшчу словы падтрымкі. «Адразу наш спікер накіраваў свае спачуванні спікеру парламента і сената. Акрамя таго, мой калега ў Мінску наведаў пасольства, выказаў спачуванні ад імя двух старшынь камісій савета рэспублікі і ад мяне. Я наведаў кансулят у Гродне і таксама выказаў свае спачуванні. Адносна Дня жалобы тут я не магу сказаць, тут сфера прэзідэнта, але я лічу, што гэта было б вельмі добра. Прэзідэнт прымае гэтыя рашэнні».

**Радыё «Рацыя»**

## Станіслаў Шушкевіч: Я лётаў на гэтым самалёце

**Першы кіраўнік незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч — пра трагедыю над Смаленскам.**

«Мне даводзілася лётаць на гэтым самалёце з Качынскім. Апошні раз ляцелі 4 чэрвеня летась у Люблін з Варшавы. Яшчэ раз лёталі ў Гданьск і назад, калі праходзіла святкаванне 90-годдзя Польскай дзяржавы.

Вельмі смуткую. Качынскі быў тым палітыкам, які добра ставіўся да Беларусі. Лех Качынскі і Марыюш Гандзлік, намеснік дзяржсакратара канцылярыі прэзідэнта, які таксама загінуў, як ніхто іншыя разбіраліся ў беларускай сітуацыі. Гэта была сумленная і канструктыўная каманда.

Раніцай сёння праглядзеў тыя віншаванні, якія мне накіравалі ў сувязі з Вялікаднем. Там было шмат віншаванняў ад людзей, якія загінулі сёння. Я нават не паспеў усім адказаць. Вельмі сумна».

**ЗП**

**Самалёт Ту-154М**

вырабляецца з 1982. Экіпаж — 3 чалавекі. Максімальная колькасць пасажыраў — 180. Крэйсерская хуткасць — 850 км/г. Дальнасць палёту з максімальнай загрузкай — 3500 км. Даўжыня разбегу — 2300 метраў. Даўжыня прабегу — 1000 метраў. Усяго выраблена 926 Ту–154 22 мадыфікацый. За ўсю гісторыю эксплуатацыі ў катастрофах і аварыях было страчана 68 самалётаў.

# Небяспечная прафесія

**Лех Качынскі стаў восьмым прэзідэнтам у свеце, які загінуў у выніку авіякатастрофы.**

Трагедыя ў небе над Смаленскам, у якой загінуў прэзідэнт Польшчы Лех Качынскі, стала далёка не першай авіякатастрофай з удзелам кіраўнікоў дзяржаў.

Найбольш значнай у сусветным маштабе палітычнай фігурай, якая стала ахвярай авіякатастрофы, быў генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый швед **Даг Яльмар Агнэ Карл Хамэршэльд**. Самалёт, у якім знаходзіўся палітык, разбіўся 18 верасня 1961 года, калі ляцеў у Конга.

У 1969 годзе ў арганізаванай авіякатастрофе загінуў прэзідэнт Балівіі **Рэнэ Бар'ентас Артуньё**.

Прэзідэнт Эквадора **Хайме Рольдас Агілера** загінуў пры нявысветленых абставінах 24 мая 1981 года. Паводле чутак, быў здзейснены замах на яго жыццё.

19 кастрычніка 1986 ў небе на мяжы ПАР, Мазамбіка і Зімбабвэ пацярпеў катастрофу Ту-134 з прэзідэнтам Мазамбіка **Саморам Машэлам** на борце. Мяркуецца, што прычынай катастрофы стала дыверсія паўднёваафрыканскіх спецслужб.

17 жніўня 1988 года з групай суправаджаючых асобаў дыктатар Пакістана, генерал **Зія-уль-Хак Махамад** на вайсковым самалёце вылецеў на вайсковую базу. На адваротным шляху смалёт упаў і разбіўся.

Увосень 1994 года ў раёне Вялікіх афрыканскіх азёраў паўстанцы збілі самалёт, у якім знаходзіліся прэзідэнт Бурундзі **Кіпрыен Натрыяміра** і прэзідэнт Руанды **Жувэналь Хаб'ярымана**. Гэта было вынікам змовы, мэтай якой было вынішчэнне племені тутсі.

Першая авіякатастрофа з удзелам кіраўніка краіны на тэрыторыі Еўропы адбылася 26 лютага 2004, калі загінуў прэзідэнт Македоніі **Барыс Трайкоўскі**. Здарэнне адбылося пры надзвычай дрэнным надвор'і на тэрыторыі Герцагавіны. Кіраўнік Македоніі ляцеў на эканамічную канферэнцыю ў Боснію.

Польскі прэзідэнт стаў восьмым у трагічным спісе.

**ВН**



**Марыю і Леха Качынскіх пахаваюць у Кракаве на Вавэлі.**

Лех Качынскі **і ягоны брат-блізнюк Яраслаў** нарадзіліся ў 1949 у разбуранай вайной Варшаве. Іх бацька Раймунд перад вайной быў інжынерам, у вайну — афіцэрам Арміі Краёвай і ўдзельнікам Варшаўскага паўстання, як і маці Ядзвіга, філолаг паводле мірнай спецыяльнасці. Тое паўстанне было патоплена немцамі ў крыві пры маўклівым назіранні саветаў. Добра, калі адзін з дзесяці яго ўдзельнікаў выжыў. Бацькам Качынскіх пашчасціла.

Яраслаў быў старэйшы за Леха на 40 хвілін, што апошні часта жартам падкрэсліваў, дадаючы, што мусіць ва ўсім слухацца старэйшага брата.

Вядомымі на ўсю краіну бялявыя Лех і Яраслаў сталі ў 13 гадоў, зняўшыся ў дзіцячым прыгодніцкім фільме «Двое, што скралі Месяц». Пасля Лех Качынскі выкарыстае гэты факт у прэзідэнцкай кампаніі, на якой будзе пазіцыянаваць сябе як «той, што нічога не скраў, апроч Месяца». Адной з галоўных сваіх задачаў ён бачыў барацьбу з карупцыяй.

Уласна палітычная дзейнасць Качынскіх пачалася з удзелу ў «Салідарнасці». У 1980–м Лех зрабіўся юрыдычным дарадцам забастовачнага камітэта Гданьска. У 1981–м Качынскі 11 месяцаў прабыў у турме. Пасля вызвалення Польшчы з–пад саветаў Лех выбіраўся дэпутатам Сойму і сенатарам. Ва ўрадзе Валэнсы ўзначальваў Бюро нацыянальнай бяспекі, Кантрольную палату. Быў міністрам юстыцыі, мэрам Варшавы. У 2000–м браты Качынскія стварылі кансерватыўнаую апазіцыйную партыю «Закон і справядлівасць» (PiS).

Браты заўжды дзейнічалі як каманда. У 2005 PiS атрымаў большасць на парламенцкіх выбарах. Яраслаў Качынскі, як лідэр партыі, мусіў стаць прэм'ерам. Але адмовіўся, каб не замінаць прэзідэнцкай кампаніі брата. І Лех перамог Дональда Туска. Яраслаў Качынскі стаў пры ім прэм'ерам.

Качынскія цвёрда адстойвалі інтарэсы Польшчы і ў ЕС, і Расіі не баяліся кідаць выклік. Пуцін меў у асобе Качынскага жорсткага крытыка. За ўвесь час свайго прэзідэнцтва Качынскі ніводнага разу не наведаў Масквы. Ён лічыў, што перш расійскі прэзідэнт мусіць прыехаць у Варшаву.

У Расіі ён быў толькі раз — у Катыні ў 2007.

Калі расійскія войскі рушылі на Тбілісі і знішчылі грузінскую СПА, польскі прэзідэнт імгненна вылецеў да Міхаіла Саакашвілі. Пакуль польскі прэзідэнт у Тбілісі, Расія не рашыцца на бамбардзіроўку горада і знішчэнне Саакашвілі, разважыў ён. Цяпер удзячны грузінскі прэзідэнт абвесціў Качынскага пасмяротна Нацыянальным героем Грузіі і паабяцаў назваць у яго гонар вуліцу ў Тбілісі.

У памяці палякаў ён застанецца як адданы патрыёт, бясстрашны змагар за незалежнасць, а пасля — з карупцыяй.

## На самалёт спазнілася толькі адна жанчына

У МЗС Польшчы паведамілі, што афіцыйная дэлегацыя павінна была складацца з 89 чалавек, але адна жанчына спазнілася на самалёт і, такім чынам, на борце знаходзіліся 88 членаў афіцыйнай дэлегацыі. Шчаслівай у Бога аказалася Зоф'я Крушынская, шараговая супрацоўніца Канцылярыі прэзідэнта Польшчы.

# Дзмітрый Гурневіч: «Польшчай кіруюць адказныя эліты»

Як павёў сябе пасля катастрофы самалёта з элітай грамадства польскі дзяржаўны і нацыянальны механізм? Гутарка з журналістам тэлеканала «Белсат» і «Польскага радыё» **Дзмітрыем Гурневічам**.

**«Наша Ніва»: Як польскі дзяржаўны механізм зрэагаваў на страту вярхоўнага кіраўніцтва?**

**Дзмітры Гурневіч:** Польская дзяржава — гэта нармальна функцыянуючая дэмакратычная структура, якая прадугледжвае адпаведныя механізмы перадачы ўлады. Абавязкі прэзідэнта перайшлі да спікера Сойма Браніслава Камароўскага. Першыя пару гадзінаў быў агульны шок. Але Польшчай кіруюць вельмі адказныя эліты, якія разумеюць важнасць моманту для краіны. Хоць у Польшчы прэзідэнт і ўрад — гэта розныя палітычныя сілы, але ўрад вельмі годна павёў сябе ў гэтыя дні. Тое кіраўніцтва, што загінула ў авіякатастрофе, ужо замененае сваімі першымі намеснікамі. Дзяржаўныя інстытуцыі працягваюць функцыянаваць — Нацыянальны банк, войска. Польшча ўжо перайшла этап трансфармацый. Тут нікому не трэба канфлікты, скандалы.

**«НН»: Ці можна ўявіць, што нехта паспрабаваў бы скарыстаць гэтую трагедыю, каб захапіць уладу?**



**ДГ:** Гэта сцэнар нейкіх афрыканскіх краін. Магчыма, Беларусі ці Расіі. Польшча — гэта краіна Еўрасаюза. Тут усё адбываецца, магчыма, недасканала, але грамадскі нагляд за вышэйшым кіраўніцтвам дасканалы. У першыя гадзіны былі думкі, што краіна можа проста «стаць», застапарыцца. Але такога не адбылося. Сітуацыя, калі нейкая хунта бярэ ўсю ўладу ў свае рукі, абсалютна не магчымая ў польскіх умовах. За гады незалежнасці Польшча сумела выгадаваць палітычную эліту, якая разумее ўсю адказнасць. Дый людзі тут такія — хоць і не ходзяць на выбары, але за сваю краіну пастаяць змогуць.

**«НН»: Якія першыя крокі на пасадзе выканаўцы абавязкаў прэзідэнта зрабіў Камароўскі?**

**ДГ:** Найперш абвясціў жалобу. Па-другое, прызначыў старшыню Бюро нацыянальнай бяспекі — гэта аналаг беларускай Рады бяспекі, кіраўніка Нацбанка. Гэта кадравыя змены. Ён прымае толькі тэхнічныя рашэнні. Нават адмовіўся прызначаць дату выбараў, даў гэтае права апазіцыйным партыям, каб яго потым не маглі ні ў чым абвінаваціць.

**«НН»: Як дзейнічалі ў гэтай сітуацыі СМІ?**

**ДГ:** Мне здаецца, што польскія СМІ занадта крытычна ставяцца да прэзідэнта, урада. Я даведаўся пра катастрофу праз паўгадзіны, як пра яе абвясцілі. Пашчоўкаў усе радыёстанцыі, паўсюль гучала сумная музыка, былі спецыяльныя ўключэнні. Фактычна, жалоба была абвешчаная яшчэ да таго, як пра яе афіцыйна заявіў Браніслаў Камароўскі. Усе пачалі вывешваць сцягі з чорнымі стужкамі, запальваць свечкі. На тэлебачанні таксама імгненна ўсе вядучыя пераапрануліся ў чорнае, вельмі стрымана ўсё каментавалі. Безумоўна, задача любога СМІ крытыкаваць улады. Але страта людзей, незалежна да якога палітычнага лагера яны сябе адносілі, вялізная трагедыя. Трэці дзень ніякіх іншых навін я папросту не бачу.

**«НН»: А што людзі? Якая атмасфера ў Варшаве?**

**ДГ:** Людзі адразу пачалі абзвоньваць адзін аднаго, тэлефонная лінія папросту не працавала. Адразу пачаўся людскі рух у бок прэзідэнцкага палаца. Ужо на прыпынках людзі пачыналі плакаць. Гэта моцна аб'яднала польскі народ. Цяпер адмыслова праходжу пешшу па вуліцах — ніхто не размаўляе. Я жыву ў маладым раёне Варшавы, дзе шмат дзяцей, весела. Усе маўчаць, могілкавая цішыня, рэдка хто ўсміхаецца. Гэта не сум напаказ. У мяне з балкона бачна дзесяць сцягоў з жалобнымі стужкамі. Старэйшыя людзі, гэта электарат прэзідэнта, плачуць. У нядзелю быў на Кракаўскім прадмесці, дзе размяшчаецца прэзідэнцкі палац, там паўсюль здымкі загінулых, знічы, кветкі. Палякі ўмеюць аб'ядноўвацца ў трагічныя моманты.

В.а прэзідэнта нават адмовіўся прызначаць дату выбараў, даў гэтае права апазіцыйным партыям, каб яго потым не маглі ні ў чым абвінаваціць.

**«НН»: Ці былі на самалёце твае знаёмыя?**

**ДГ:** Паколькі я працую журналістам, то шмат з кім даводзілася працаваць. Браць каментары ці нешта яшчэ. Але двух чалавек я ведаў прыватна. Першы — гэта старшыня Катынскага камітэта Стэфан Мэляк. Яшчэ за савецкім часам ён разам з сябрамі завёз на адны варшаўскія могілкі аграмадны 10-тонны першы ў Польшчы помнік у гонар ахвяраў катынскай трагедыі. Ніхто не ведае як. Праўда, помнік той знішчылі ўжо на другі дзень. Мы пазнаёміліся восем гадоў таму. Ён вадзіў беларускіх студэнтаў па Варшаве, паказваў памятныя мясцы. Ён быў гісторыкам. Такой гісторыі Польшчы і Беларусі, як ад яго, я яшчэ не чуў. Менавіта ад Мэляка я і даведаўся пра Катынь, бо ў беларускай школе мы чулі толькі пра Хатынь. Таксама загінуў рэктар універсітэта, дзе я вучыўся, ксёндз Румянэк. Ён выкладаў у нас тры разы на тыдзень цягам пяці гадоў. Усе хадзілі на ягоныя заняткі. У 2006 годзе, калі я з Плошчы трапіў на Акрэсціна, рэктар падпісаў ліст у пасольства з патрабаваннем майго вызвалення.

І дэпутаты, і міністры, што загінулі, былі вельмі вялікімі сябрамі Беларусі. Яны лічылі сваім абавязкам дапамагаць Беларусі. Гэтыя людзі стварылі Праграму Каліноўскага, «Белсат», «Рацыю». Адначасова яны былі вялізнымі польскімі патрыётамі, любілі сваю краіну. Магчыма, яны былі крыху архаічнымі, рамантыкамі. Гэтыя людзі штодня былі ў СМІ, тут іншая палітычная культура. Апроч усяго нейкіх палітычных спрэчак, яны расказвалі пра сваю сям'ю, паказвалі дамы.

**«НН»: Які цяпер палітычны расклад перад прэзідэнцкімі выбарамі?**

**ДГ:** Пра гэта пакуль ніхто не думае. Выбары павінны адбыцца не пазней за 20 чэрвеня. Загінулі два кандыдаты ў прэзідэнты. Ад правых — Лех Качынскі, ад левых — Ежы Шмайдзінскі. Думаю, выбары пройдуць досыць ціха. Без гарачых дэбатаў, абмеркаванняў. Па ўсім бачна, што новым прэзідэнтам будзе Браніслаў Камароўскі. Не думаю, што будуць нейкія нечаканасці. Сваёй працай ён даказаў, што годны гэтага.

**«НН»: А прыход Камароўскага не адаб'ецца на палітыцы Польшчы ў дачыненні Беларусі?**

**ДГ:** Не. Камароўскі — сябар «Грамадзянскай платформы», якую ў беларускіх СМІ лічаць нейтральнай па беларускім пытанні. Але гэта не так. Яны заўсёды падтрымлівалі ўсе ініцыятывы па Беларусі. Ніхто ў Польшчы, хто б ні прыйшоў да ўлады, не зменіць палітыку ў дачыненні нашай краіны.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Дзьмітрый Гурневіч**

нар. у 1983 у вёсцы Налібакі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў факультэт журналістыкі Універсітэта імя кардынала Вышынскага ў Варшаве. Працуе на Польскім радыё для замежжа і тэлеканале «Белсат».

# Запавет Леха Качынскага

Піша **Віталь Тарас**.

На трэці дзень пасля трагедыі пад Смаленскам польская газета «Rzeczpospolita» надрукавала тэкст прамовы прэзідэнта Качынскага, з якой ён меў выступіць у Катыні. (Беларускі пераклад у той самы дзень з'явіўся на сайце «НН».)

Качынскі хацеў нагадаць пра тое, што «гэтае забойства было здзейсненае з волі Сталіна, па загадзе найвышэйшага кіраўніцтва Савецкага Саюза. Саюз Трэцяга рэйха і СССР, пакт Рыбентропа-Молатава і агрэсія супраць Польшчы 17 верасня 1939 года выліліся ў жудасную кульмінацыю масавых забойстваў у Катыні. І не толькі ў лясах Катыні, а і ў Цверы, Харкаве і іншых вядомых і яшчэ невядомых месцах былі забітыя грамадзяне Другой Рэчы Паспалітай, людзі, якія сталі ля вытокаў нашай дзяржаўнасці, нязломныя ў служэнні Радзіме... Яны былі ахвярамі неабвешчанай вайны. Іх забілі, пагарджаючы законамі і звычаямі цывілізаванага свету, растаптаўшы іх годнасць — салдацкую, польскую, чалавечую... Катынь стала балючай ранай у гісторыі Польшчы і на працягу многіх дзесяцігоддзяў атручвала стасункі паміж палякамі і расійцамі. Давайце ж зробім усё, каб рана



Катыні нарэшце загаілася. Мы ўжо ідзём да гэтага... Усе абставіны катынскага расстрэлу мусяць быць цалкам высвечаныя і растлумачаныя. Важна, каб была пацверджаная юрыдычная невінаватасць ахвяраў, каб былі рассакрэчаныя ўсе дакументы, якія датычаць гэтага злачынства. Хлусня пра Катынь мусіць назаўжды знікнуць з грамадскай прасторы».

Гэтыя словы варта параўнаць з тым, што казаў расійскі прэм'ер Уладзімір Пуцін 7 красавіка ў Катыні падчас жалобнай цырымоніі, у якой удзельнічаў разам з польскім прэм'ерам Дональдам Тускам. Перад прамовай Пуціна Туск згадаў у сваім выступе расійскага пісьменніка Аляксандра Салжаніцына: «Слова праўды ўвесь свет перацягне».

Пра неабходнасць ачысціць праўду аб катынскіх расстрэлах пасля дзесяцігоддзяў цынічнай хлусні гаварыў і Пуцін. Ён казаў пра рэпрэсіі, што «руйнавалі людзей, не разбіраючы нацыянальнасці і перакананняў, рэлігій... Казацтва, святары, простыя сяляне, прафесары і афіцэры. Логіка была адна: пасеяць страх, абудзіць у чалавеку самыя нізкія інстынкты, нацкаваць людзей адзін на аднаго, прымусіць слепа і бяздумна падпарадкоўвацца. Гэтым злачынствам не можа быць ніякіх апраўданняў... Перад гэтымі магіламі, перад людзьмі, якія прыходзяць сюды ўшанаваць памяць сваіх блізкіх, было б крывадушна сказаць: давайце ўсё забудзем...Не. Мы абавязаны захоўваць памяць пра мінулае. І , канечне, будзем гэта рабіць, якой бы горкай ні была гэтая праўда. Нам не дадзена яе змяніць. Але ў нашых сілах захаваць, аднавіць праўду і гістарычную справядлівасць».

Відавочна, гэта не тыя словы, якіх чакалі ад кіраўніка расійскай улады мільёны палякаў. У прамове Пуціна не было не толькі прабачэнняў, у ёй не называюцца імёны катаў, не згадваюцца роля НКВД, самі абставіны злачынства — нічога з таго, пра што хацеў сказаць суайчыннікам, расійцам і ўсяму свету Качынскі. І ўсё ж прамова расійскага прэм'ера была важнай, бо ў ёй недвухсэнсоўна асуджаны самі сталінскія рэпрэсіі і спробы іх схаваць ці апраўдаць. Важным крокам стаў ужо сам прыезд Пуціна ў Катынь. Важным, але далёка не апошнім на шляху да ісціны.

Калі я напісаў пра гэта ў сваіх нататках пра гібель польскай дэлегацыі на сайце «НН», адзін з яго наведнікаў абвінаваціў мяне ў русафобіі. Мяне гэта не здзівіла, бо на расійскіх сайтах у гэтыя жалобныя дні можна прачытаць дзясяткі, калі не сотні падобных меркаванняў.

Пуцін або які-небудзь іншы кіраўнік расійскай дзяржавы — яшчэ не ўвесь расійскі народ, і крытыка асобнага палітыка, якія б высокія рэйтынгі ён ні меў у сябе ў краіне, не звернутая супраць расійскіх грамадзян.

Іншая справа, што пераважная частка расійцаў (гэта паказваюць апытанні, напрыклад, на радыё «Эхо Москвы») дый беларусаў, напэўна, дагэтуль упэўнены, што палякаў у Катыні расстрэльвалі немцы. І гэта пры тым, што сапраўдныя дакументы пра яе можна прачытаць у расійскай Вікіпедыі. Ды шмат дзе яшчэ можна даведацца пра трагедыю — хай пакуль не ва ўсіх яе дэталях — у кнігах, фільмах, прэсе.

Але наіўна думаць, што праўда, аднойчы даведзеная да людзей праз СМІ, імгненна іх змяніць. Што калі паказаць, напрыклад, фільм Вайды «Катынь» на беларускім тэлебачанні, усе стануць відушчымі і зразумеюць увесь маштаб катынскай трагедыі, яе наступствы, адрэчацца хлусні і прапаганды. Заўсёды ў зла будуць свае прыхільнікі, ахвотныя яго апраўдаць. Гэта не значыць, што не трэба гаварыць праўду, змагацца за яе ўсімі даступнымі спосабамі.

Толькі гэта катэгорыя не палітычная і не гістарычная нават, але маральная. Катастрофа пад Смаленскам нагадала ўсім нам пра нешта вельмі важнае. Нагадала, як напісана ў несказанай прамове Леха Качынскага, пра годнасць — салдацкую, польскую, чалавечую.

**Замест «Катыні» — «Танцы з зоркамі»**

11 красавіка тэлеканал «Расія» адразу пасля вечаровай аналітычнай праграмы паказаў фільм Анджэя Вайды «Катынь». Такія змены ў раскладзе адбыліся пасля трагічнага здарэння ў Смаленскай вобласці, дзе загінуў прэзідэнт Польшчы Лех Качынскі. У Беларусі, аднак, паказ фільма перакрылі. Замест гэтага ў эфіры з'явілася забаўляльная перадача «Танцы з зоркамі».

# Сотні тысяч палякаў сустракалі ў Варшаве труну Качынскага

Дачка Качынскага плакала. Уздоўж дарогі тлумы спявалі нацыянальны гімн «Ешчэ Польска не згінэла» і здымалі момант на лічбавыя камеры.

Самалёт з труной Леха Качынскага прыбыў у аэрапорт Акенце. Там адбылася кароткая імша. Прысутнічала ўсё кіраўніцтва краіны і сваякі. Дачка Леха Качынскага Марта плакала. 83-гадовай маме прэзідэнта пакуль страшную навіну не паведамілі: яна ляжыць у кардыялогіі, і дактары забаранілі.

Жонку прэзідэнта, Марыю, апазналі толькі праз тры дні. Труну з яе целам таксама ўрачыста правезлі вуліцамі Варшавы.

Брат прэзідэнта Яраслаў быў другім, хто падышоў да труны памаліцца. Перад дамавінай ён укленчыў.

Пасля жалобны картэж паехаў вуліцамі Варшавы — горада, у якім Качынскі быў мэрам, перш чым стаць прэзідэнтам. Ён праехаў Жвіркі і Вігуры, алеі Ерузалімскія, Маршалкоўскую і, нарэшце, Кракаўскае прадмесце. Уздоўж усяго шляху стаялі людзі. Пад колы катафалка ляцелі букеты. Народ крычаў прэзідэнту апошняе «Брава». Білі званы касцёлаў, гучаў Шапэн.

Польская нацыя згуртавалася ў вялікім горы.

Труны з целамі Леха Качынскага і ягонай жонкі, з якой яны жылі душа ў душу, былі выстаўленыя для развітання ў капліцы Прэзідэнцкага палаца. Месца пахавання вызначанае: Вавэль – месца спачыну польскіх каралёў. Лех і Марыя скончаць там зямны шлях у нядзелю.

**Сяргей Гезгала**



**Дачка і брат Леха Качынскага перад труной.**



Юлія Дарашкевіч

**Апазнаць цела брата прыляцеў былы прэм'ер Польшчы Яраслаў Качынскі, як дзве кроплі вады падобны да брата. Беларусь дазволіла польскай дэлегацыі прызямліцца ў Віцебску без афармлення транзітных візаў.**

# «Па тэлевізары сказалі, што тут разбіўся прэзідэнт»

Вайсковы аэрадром у Смаленску знаходзіцца на паўночнай акраіне горада, адразу на выездзе ў кірунку трасы Мінск–Масква. У савецкія часы на аэрадроме і ў ваколіцах віравала жыццё, а сёння ён аточаны спальнымі мікрараёнамі і прамзонай.

Аб былых часах нагадваюць толькі шэрагі састарэлых самалётаў, што віднеюцца з-за агароджы.

Днём 10 красавіка ўсе пад'езды да аэрадрома былі закрытыя. З кожнага кірунку дарога была перакрытая адразу некалькімі пастамі ДПС і міліцыі. Прапускалі толькі машыны спецслужбаў, вайскоўцаў, МНС, міліцыі і журналістаў. Апошніх, што праўда, падпускалі да месца катастрофы намінальна — наблізіцца было немагчыма. Толькі ў тым месцы, дзе самалёт зачапіў верхавіны дрэваў, можна было падысці да вялікага фрагмента крыла, які адламаўся пры кантакце з лініяй электраперадач. У гэтым месцы сабраліся відавочцы падзей, якія ахвотна апавядалі журналістам аб падзеях раніцы 10 красавіка.

Паводле іх словаў, каля 11-й гадзіны па смаленскім часе над аэрадромам з'явіўся бела-чырвоны пасажырскі самалёт. Ён зрабіў некалькі кругоў над ім, перыядычна хаваючыся ў густым тумане, затым зрабіў спробу знізіцца, а на падлёце да пасадачнай паласы раптам нахіліўся і зачапіў крылом галіны дрэваў. Пасля гэтага самалёт яшчэ праляцеў каля 150 метраў і ўпаў за агароджай аэрадрома, непадалёк ад узлётнай паласы. Катастрофа магла скончыцца яшчэ больш крывава — самалёт упаў усяго за сотню метраў ад запраўкі, аўтасалона і гатэля.

«Мы дакладна не ведаем, хто там ляцеў, што гэта быў за самалёт. Па тэлевізары кажуць, што прэзідэнт Польшчы нібыта разбіўся тут», — адказвалі жыхары Смаленска.

Адзінай афіцыйнай крыніцай інфармацыі быў прэс-сакратар смаленскага губернатара, які знаходзіўся ля бліжэйшага да месца катастрофы ўезда на аэрадром. Аднак ён толькі і мог, што паўтараць: «Пакуль нічога невядома. Чакайце новую інфармацыю». Пры гэтым нават не даставаў цыгарэты з зубоў.

А на аэрадром тым часам заязджалі вайсковыя грузавікі, даверху нагружаныя трунамі.

**Алесь Пілецкі, Смаленск-Мінск**

# Польскі прэзідэнт не дазваляў сабе купіць новы самалёт

У Польшчы больш ніхто не лётаў старэнькімі Ту–154 — ніхто, акрамя кіраўнікоў дзяржавы.

Кіраўнікі Польшчы не дазвалялі сабе купіць новых самалётаў, хоць паломкі «Тупалевых» здараліся, і не раз. Аднойчы польскі прэзідэнт спазніўся ў замежны візіт. Другі раз прэзідэнцкім самалётам не змаглі вярнуцца польскія ратаўнікі з Гаіці.

Дыктатары ездзяць на «Мерсэдэсах» апошніх мадэляў і не адмаўляюць сабе ў новых «Боінгах». Зрэшты, як пісалася ў «Слове пра паход Ігараў» пра Усяслава Чарадзея, «ні хітраму, ні спрытнаму... суда Боскага не мінуць». Смерць і выпадак усіх раўняюць.

Лех Качынскі заслугоўвае свечкі і ад беларусаў. Да яго левыя ўрады шмат гаварылі аб падтрымцы дэмакратыі ў Беларусі, але на справе абмяжоўваліся фінансаваннем польскай дыяспары і Дамоў польскіх, калі не лічыць датацый на беларускую культуру Падляшша. Толькі калі да ўлады прыйшло «Права і справядлівасць», знайшліся грошы на падтрымку ўласна беларускай культуры і супольнасці. Паўстаў першы ў гісторыі цалкам беларускамоўны тэлеканал — «Белсат», гэтак важны для захавання мовы і стварэння культуры, аднавіла вяшчанне трансгранічнае радыё «Рацыя», а сотні беларускіх студэнтаў і аспірантаў займелі шанец на еўрасаюзаўскую адукацыю ў рамках Праграмы Каліноўскага.

Усё гэта было рэакцыяй на ўпартасць і адданасць нацыянальнага дэмакратычнага руху ў Беларусі, захопленнем мужнасцю абаронцаў Плошчы ў 2006 годзе. Але ўсё гэта было таксама вынікам этыкі братоў Качынскіх. Вялікім рахункам, Качынскі і, шырэй беручы, польскі ўрад не дазвалялі сабе купіць новы самалёт, але знаходзілі грошы на «Белсат».

Дарэчы, рашэнне аб куплі новага лайнера прэзідэнт Польшчы не мог прыняць сам, гэта мусіла быць рашэнне ўрада, ухваленае парламентам, праведзенае праз бюджэт. У выніку ўзнікалі спрэчкі між прэзідэнтам і прэм'ерам, каму, куды і з кім ляцець.

...Які лёс — загінуць, летучы ў Катынь. Таямнічая смерць Сікорскага пад Гібралтарам, цяпер катастрофа пад Смаленскам. Польскі прэзідэнт загінуў там, дзе пахаваны цвет польскай інтэлігенцыі. Той, якая заклала і выхавала этыку, якой кіраваўся і Качынскі.

**Андрэй Дынько**

# Фільм пра Вітаўта будзе трохі як «Аляксандр Неўскі»

Закаханы ў ВКЛ сінопсіс Качана адкінулі.

Тэлеканал АНТ мае зняць гістарычны фільм пра Вітаўта Вялікага — выбітнага дзяржаўнага лідэра Вялікага Княства. Вітаўт быў пераможцам Грунвальда, 600-годдзе якога святкуецца сёлета. Гэтая бітва і мае стаць натуральным цэнтрам карціны.

Сцэнар спачатку замовілі Аляксандру Качану, аўтару «Акупацыі». Качан задумаў вострасюжэтны прыгодніцкі фільм у чатырох серыях. Герой — палонны крыжак, які закахаўся ў беларуску. Зачараваны талерантнасцю Вялікага Княства і мудрасцю Вітаўта, ён пераходзіць на яго бок. Прыгоды маладых людзей разгортваюцца на фоне Грунвальдскай бітвы. У сюжэт уплеценая і інтрыга з сарванай каранацыяй Вітаўта.

Сінопсіс Качана ствараў вобраз ідэальнага Вялікага Княства, дзе розныя народы жывуць у міры за мудрым Вітаўтам.

Такі падыход не задаволіў тэлеканал. Сінопсіс падправілі, змянілі акцэнты. «Кепскія» героі набылі лацінскія прозвішчы, у сцэнары з'явіліся польскія інтрыгі і кашмары нямецкай акупацыі. Сцэнарыст ад супрацы з каналам адмовіўся, засяродзіўшыся над «Каласах пад сярпом тваім» — праекце, патранаваным міністрам Латушкам.

Цяпер працу з сюжэтам даручылі Ігару Тароцьку, сцэнарысту кінакамедыі «На спіне ў чорнага ката», дзе знялася ўнучка Лукашэнкі Вікторыя. Паводле яго задумы, замежнікі ў фільме будуць размаўляць на сваіх мовах, а беларусы — па-расейску.

**«Кепскія» героі набылі лацінскія прозвішчы, у сцэнары з'явіліся польскія інтрыгі і кашмары нямецкай акупацыі.**

Рэжысёрам мае стаць Аляксей Раковіч. Ён не мае пастановачнага досведу мастацкіх фільмаў, затое зняў дакументальную стужку «Хатынь». Відаць, на АНТ разважылі, што раз зняў пра нямецка-фашысцкіх захопнікаў, здыме і пра нямецка-крыжацкіх.

З іншага боку, у фільме мяркуецца асцярожна прызнаць гістарычнасць бел-чырвона-белага сцяга і Пагоні. «Мы адабралі гэта ў нягоднікаў, цяпер можам вяртаць», — сказаў на абмеркаванні праекта ў кулуарах прадусар АНТ Аляксандр Рыдван.

**Андрэй Расінскі**



**Вітаўт Вялікі**
кіраваў ВКЛ ад ад 1392 да 1430. Пачынаў кіраванне сярод смуты, скончыў сярод славы. Пры ім нашы продкі пашырылі межы ад мора да мора, назаўжды спынілі германскі націск на ўсход. І вяршылі лёсы Масквы. Вітаўт дафармаваў ВКЛ як дзяржаву, арыентаваную на заходнееўрапейскую цывілізацыю. Старабеларуская мова была дзяржаўнай.

# Услед за музыкай — квота на беларускія фільмы?

Міністэрства культуры прапаноўвае ўвесці квоту на паказ нацыянальнага кіно на беларускіх тэлеканалах.

Міністр культуры Павал Латушка заявіў, што ў Беларусі трэба мяняць сістэму кінематографа. Міністр прапануе пераход ад цалкам дзяржаўнай да дзяржаўна-рыначнай сістэмы. Маўляў, кінематограф будзе зарабляць грошы сам, але дзяржава ад яго падтрымкі не адмовіцца. На практыцы гэта азначае наступнае. «Неабходна на заканадаўчым узроўні вызначыць працэнт паказу беларускіх фільмаў ад усіх фільмаў на тэлеканалах, — цытуе словы Латушкі БЕЛТА. — Няхай гэта будзе 20, 21, 25 працэнтаў...»

Міністр прапануе абмежаваць сродкі, якія ідуць на айчынную кінаіндустрыю з бюджэту. На яго думку, толькі такія меры прывядуць да актыўнага пошуку інвестараў для кінематографа. Па яго словах, альтэрнатывай для зарабляння грошай можа стаць збор адлічэнняў з паказу ў краіне ўсіх замежных фільмаў.

Кіраўнік прыватнай Мінскай кінашколы-студыі Андрэй Палупанаў аптымізму Паўла Латушкі не падзяляе. «Беларускае кіно не хочуць глядзець не таму, што яно добрае, але не раскручанае. Хутчэй таму, што не дацягвае па сваім мастацкім узроўні да тых патрабаванняў, якія выстаўляюць беларускія гледачы». А.Палупанаў бачыць выхад у іншым. На яго думку, трэба адысці ад манаполіі «Беларусьфільма», развіваць канкурэнцыю ў кінабізнесе, рыхтаваць спецыялістаў.

Раней на радыё была ўведзена квота ў 75% на беларускую музыку. Чаканых вынікаў дасягнулі напалову. Такі крок дазволіў зрабіць больш пазнавальнымі твары айчынных спевакоў, але якасць іх музычнага прадукту значна не палепшала.

Дарэчы, у плэй-лісты радыёстанцый трапілі толькі лаяльныя выканаўцы. Адначасова з квотай існаваў негалосны «чорны спіс» з непажаданых музыкаў, якія займалі незалежніцкую пазіцыю. Ці пакажуць на дзяржаўных тэлеканалах, у межах беларускай квоты, «Акупацыю» Кудзіненкі, «Тутэйшых» Мазынскага, дакументальныя фільмы «Белсату»? Толькі гэта павялічыла б канкурэнцыю сярод кінавытворцаў.

**Кастусь Матушыч**

## СЦІСЛА

### Грунвальд-фэст

«Грунвальд-фэст» пройдзе 24 красавіка ў Сілічах. Удзел пацвердзіла больш за 200 чалавек — сябраў вайскова-гістарычных клубаў, беларускія фолк- і рок-гурты («Унія», «Рокаш», Ars Longa) — усяго больш за 10 калектываў. Плануецца правядзенне рыцарскіх турніраў, масавых бітваў, турніра лучнікаў, інсцэніроўкі штурму войскамі князя Вітаўта замка крыжакоў. На працягу дня будуць таксама праходзіць музычныя выступы. Госці змогуць паўдзельнічаць у конкурсах, павучыцца старажытным танцам і разнастайным традыцыйным рамёствам. Праграму завершыць вогненнае прадстаўленне экстрым-тэатра «Берсерк».

### «Басовішча» сёлета пройдзе 16—17 ліпеня

У гэтым годзе арганізатары спрабуюць скіраваць фестываль у бок разнастайнасці. Акрамя музычных выступаў, запланаваныя літаратурныя сустрэчы, паказ фільмаў ды фотавыстава. Акрамя таго, арганізатары «Басовішча» хочуць ушанаваць памяць Ларысы Геніюш, 100-гадовы юбілей якой адзначаецца сёлета. Прапанавана, каб кожны гурт, які захоча выступіць у конкурснай частцы, падрыхтаваў адну песню на словы паэткі.

### Вольскі здымае кліп на песню «Пахне чабор»

Два тыдні таму прайшла прэзентацыя праекта Лявона Вольскага «Белая яблыня грому». Дванаццаць вершаў беларускіх класікаў і сучаснікаў былі пакладзеныя на музыку. 8 красавіка знаёмы ўсім са школьных часоў верш Петруся Броўкі «Пахне чабор» пачаў набываць яшчэ і «відэаўвасабленне». Лявон Вольскі здымае кліп разам з рэжысёрам Анатолем Вечарам. Пабачыць яго можна будзе ў праграме «PROдвижение+».

### Візы на Be2gether афармляюцца па папярэдняй рэгістрацыі

Літоўскія візы сёлета будуць бясплатнымі. Пра гэта паведаміў пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас. Але толькі для тых, хто набудзе білет на фестываль. Білеты ўжо паступілі ў продаж. Замовіць іх можна па тэлефонах (029) 6-55-55-96, (033) 6-55-55-96, а таксама на сайце www.soundline.by. Be2gether — транспамежны рок-фестываль, які пройдзе 25—27 чэрвеня ля літоўскага замка XVI ст. Нарвілішкі, што за 150 км ад Мінска і за 100 м ад беларуска-літоўскай мяжы.

**НШ, АП; радыё «Рацыя»**

## КАЛЯНДАР

### Адкрывальнік Багдановіча

20 красавіка спаўняецца стагоддзе з дня трагічнай смерці нашаніўца Сяргея Палуяна. Ён пражыў няпоўныя дзевятнаццаць гадоў.



Сяргей Палуян нарадзіўся 19 кастрычніка 1890 года ў Брагіне. Ужо ў 15 гадоў, у 1905-м, з-за сувязі з сацыялістамі ў хлопца ўзніклі першыя канфлікты ў сям'і. Адміністрацыя мазырскай прагімназіі, дзе хлапец вучыўся, параіла бацькам забраць сына дадому. Але гэта не дапамагло. І бацька выгнаў Сяргея. Юнак накіраваўся ў Кіеў, дзе пачаў зарабляць напісаннем рэцэнзій і артыкулаў для ўкраінскіх газет. Пасля было знаёмства з «Нашай Нівай». Супрацоўніцтва з газетай прывяло Палуяна ў Вільню. Там ён уступіў у Беларускую сацыялістычную грамаду.

Менавіта Палуян адшукаў у архіве «Нашай Нівы» сшытак з вершамі Максіма Багдановіча. Рэдакцыя палічыла іх незразумелымі для селяніна, а Ядвігін Ш. ахрысціў «дэкадэнскімі». Але Палуян разглядзеў у Багдановічу генія ды настаяў на тым, каб вершы друкаваліся.

У 1910 годзе Сяргей Палуян зноў перабраўся ў Кіеў. Хто мог думаць, што жыццё гэтай энергічнай, кіпучай натуры так гвалтоўна перарвецца.

«...Жыццё не вартае таго, каб жыць. У марах жыццё — казка, а спраўдзі — гніццё раба і вечная незабяспечанасць, — напісаў ён у апошнім лісце да аднаго з сяброў. — Перадайце шчыры прывет беларусам. Багата я думаў зрабіць, ды не зрабіў нічога. Шкода паміраць так марна, але трэба. Няхай... І яшчэ адна драбніца: я ўміраю «пошло», павесіўшыся. Бо не было змогі купіць рэвальвера...»

Афіцыйная версія смерці — самагубства, хаця некаторыя даследчыкі выказваюць версію пра гвалтоўную смерць. Пахаваны Палуян на кіеўскіх Байкаўскіх могілках.

«Вянок» Максіма Багдановіча прысвячаецца Сяргею Палуяну. Янка Купала прысвяціў яму паэму «Курган», Цішка Гартны верш. Палуян і сам пісаў мастацкія творы. Але шмат што з напісанага згінула. Спадчына, што захавалася, была выдадзеная кнігай «Лісты ў будучыню».

**КМ**

### Чуткі пра яго смерць моцна перабольшаныя

Марк Твен, аўтар «Тома Соера», «Гекльберы Фіна», «Янкі пры двары караля Артура» памёр сто гадоў таму, 21 красавіка 1910 г. Прапануем вашай увазе тры прычыны, чаму гэты амерыканскі пісьменнік па–ранейшаму чытаны.



Па-першае, Твен навучыў свет беспакарана кпіць з палітыкаў і дэспатаў. Вядома, ён не здолеў паставіць палітыкаў на месца, але прынамсі паказаў чалавецтву, дзе гэтае месца знаходзіцца.

Яму ўдалося тое, чаго не здолеў Джонатан Свіфт у «Гуліверы». У намаляваных Свіфтам вобразах сучаснікі лёгка пазнавалі палітыкаў той эпохі. Твен дасягнуў тонкага балансу надзённага і вечнага. Дастаткова было перанесці ўсе галоўныя дылемы чалавецтва на дзіцячае жыццё («Прыгоды Гекльберы Фіна») або ў іншы час («Прынц і жабрак»).

Яшчэ Твен вынайшаў пару папулярных сёння жанраў. Мы намякаем на «Янкі пры двары караля Артура». Тут і навуковая фантастыка (падарожжы ў часе) і пачатак фэнтэзі (дэкарацыі Твен замілавана спісаў са старажытных ангельскіх паданняў). Цяпер Твенава вынаходства — крыніца натхнення для шматлікіх літаратараў і кіношнікаў.

І наастатак, Марк Твен навучыў чалавецтва творчаму падыходу ў бізнэсе. Як тут не згадаць сцэну фарбавання плота, які Том Соер з дапамогай невялікіх хітрыкаў ператварае ў зайздросны занятак і крыніцу заробку. Тут і рэбрэндынг з рэфрэймінгам, і франчайзынг, і сеткавы маркетынг.

**ЛК**

# Навагрaдскі замак: адбудоўваць ці адкопваць?

Піша **Алег Дзярновіч**.

Міністэрства культуры ініцыявала кампанію па рэстаўрацыі Навагрaдскага замка. Менавіта ён быў абраны для пачатку маштабнага праекта па аднаўленні беларускіх замкаў пасля ваганняў, які аб'ект паставіць першым у спісе — можа яшчэ Крэва ці Гальшаны? Перамагла сімвалічнасць Навагрaдка для беларускай гісторыі. А заняцца адначасова ўсімі ўрад з фінансавых прычын не гатовы.

Таму і вынайдзены новы варыянт фінансавання рэстаўрацыйных прац — праз латарэю «Скарбніца». Латарэі сталі новым нацыянальным хобі беларусаў, так што можна вітаць пранікненне PR-тэхналогій у рэстаўрацыйную справу. Кожны білет каштуе 2500 рублёў, што супастаўна з коштам дзвюх цаглінаў. Сцвярджаецца, што, купляючы «Скарбніцу», кожны з нас набывае дзве цагліны на аднаўленне замка.

Для прыватных і карпаратыўных ахвяраванняў на адбудову Навагрaдскага замка ў Беларусі таксама адкрыты асобны рахунак. Што ж можа атрымацца з Навагрaдскага замка, у якой ступені варта рэканструяваць тыя ці іншыя яго часткі?

## Пачаткі Навагрaдка

Навагрaдак уласна і пачынаўся з тых пагоркаў, на якіх стаіць замак, — сённяшняя візітоўка горада і краіны. Археалагічныя даследаванні паказалі, што ў X—першай палове XI стст. былі заселеныя тры ўзвышшы ў паўночнай частцы сучаснага горада. Гэта Замкавая гара і Малы замак, а таксама мясцовасць, дзе пазней была пабудаваная царква Святых Барыса і Глеба. Узвышшы засяляліся адначасова і складалі своеасаблівае гняздо з трох паселішчаў.

Хто былі першыя насельнікі? Археолагі не даюць пэўнага адказу. Ёсць у знаходках дрыгавіцкія рысы, таксама адчуваецца прысутнасць крывічоў, валынян, сляды заходніх славянаў — мазаўшанаў. У ранніх паселішчах яшчэ прысутнічаюць сляды балтаў.

Старажытныя гарады Панямоння ўзнікалі рознымі шляхамі. Адзін з іх — перарастанне племяннога цэнтра ў паселішча гарадскога тыпу. Так паўстаў і Навагрaдак.

Ужо ў другой палове XI ст. Замкавая гара мела насыпны вал і дзядзінец. Малы Замак зрабіўся пасадам, гандлёва-рамесніцкай часткай паселішча за межамі ўмацаванняў. Так узнік горад. Адна з версій так і тлумачыць паходжанне назвы: Навагрaдак — як новапаўсталы горад на месцы ранейшых паселішчаў. Умацаванні Замкавай гары з вала і драўляных сцен па версе на працягу XI—XIV стст. як мінімум пяць разоў удасканальваліся: найперш пашыраўся і падвышаўся вал. Было чаго: набегі балтаў, кіеўскіх, галіцка-валынскіх дружынаў, пасля крыжакоў не давалі разляніцца.

## Высокая культура

Навагрaдак — загадка. Чаму ў такім адносна невялікім месце ў XII—XIII стст. панавала такая дасканалая матэрыяльная культура?

У той час, калі нават у Ноўгарадзе Вялікім печы палілі па-чорнаму, багатыя дамы Навагрaдка мелі коміны. Доказам гэтага з'яўляецца, між іншым, і тое, што на фрэсках у такіх дамах зусім няма слядоў сажы.

Сам фрэскавы роспіс навагрaдскай жылой пабудовы XII ст. унікальны. Для старажытнарускага будаўніцтва фрэскі — гэта ўласцівасць храмаў. У Навагрaдку ж імі аздаблялі сваё жытло заможныя людзі. Але гэтыя роспісы ў нечым падобныя на фрэскі навагрaдскага Барысаглебскага храма.

Яшчэ адна адметнасць старажытнага Навагрaдка — шырокае ўжыванне аконнага шкла. Шыбы ў той час мелі выгляд дыскаў дыяметрам каля 20 см. Такое шкло добра вядомае па матэрыялах раскопак Кіева. Трапляецца яно таксама ў Тураве, Пінску, Ваўкавыску, Гродне. Але гэта адзінкавыя знаходкі, і толькі ў Навагрaдку на Малым замку вялікія дамы былі паўсюдна зашклёныя!

У канцы XIII ст. сканчаецца старажытны перыяд у гісторыі Навагрaдка і Замкавай гары. На дзядзінцы, што выстаяў перад войскамі валынскага князя, а ў далейшым і перад Ордэнам, пачынаецца інтэнсіўнае будаўніцтва. Паўстае сямівежавы замак — адзін з наймагутнейшых у тыя часы.

## Мураваны замак

Навагрaдскія ўмацаванні на працягу XI—XIV стст. заставаліся драўляназемлянымі. У гэтым няма нічога дзіўнага, калі ўлічыць, што бутавы камень быў у дэфіцыце, а лясы, наадварот, займалі асноўную тэрыторыю краю. Цэгла ж, якая у той час была тонкай (плінфа), ішла на будаўніцтва цэркваў. Па-свойму, улічваючы ландшафт і клімат, драўляныя ўмацаванні былі даволі дасканалымі для свайго часу.

Апошнія даследаванні не пацвердзілі версію археолага і гісторыка Міхася Ткачова пра існаванне ў старажытным Навагрaдку мураванай вежы-данжона (кшталту Камянецкай), галоўнай у сістэме драўляна-земляных умацаванняў. Раскопкі Валянціна Собаля 2000—2002 гадоў паказалі, што вежа Шчытоўка, на месцы якой, лічыў Ткачоў, раней стаяў данжон, будавалася на свежым месцы.

Але сутыкненне з крыжацкай экспансіяй, а таксама патрэба ў рэпрэзентатыўных функцыях ужо новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, прымушалі будаваць мураваныя замкі.

Будаўніцтва каменных сцен і вежаў у Навагрaдку пачаў князь Вітаўт. Нават крыжацкія рэйды 1391 і 1394 гг. перашкодзіць маштабнаму будаўніцтву не здолелі.

У канцы XIV — пачатку XV стст. былі ўзведзены вежы Шчытоўка, Касцёльная і Малая брама. Дзве першыя часткова захаваліся і сёння, менавіта яны ўзвышаюцца над Замкавай гарой, ствараючы запамінальны краявід старажытнага горада.

Пацвердзілася іншае меркаванне Міхася Ткачова — пра мадэрнізацыю замка ў канцы XV ст. «Апгрэйд» быў выкліканы новай ваеннай пагрозай — з боку крымскіх татар. Нават далёкая ад Крыма Вільня, адзіная ў ВКЛ, была цалкам абнесеная мурам у пачатку XVI ст. Бо мабільныя аддзелы татараў былі бездапаможныя перад мураванымі ўмацаваннямі.

У XVI ст. Навагрaдскі замак паўстаў у закончанай форме. Схілы Замкавай гары былі ўзятыя ў гліняны замок метровай таўшчыні. Узмацніўся вал. Паўсталі новыя каменныя вежы: Калодзежная, Пасадская, Меская і Дазорца. Апошняя стаяла над паўночназаходнім схілам Замкавай гары, лявей ад Шчытоўкі, і была самай высокай у замку. Усе вежы злучаліся мураванымі сценамі двухметровай таўшчыні, вышынёй у 8 м. Рэшткі таго мура, вышынёй 3,2—3,4 м, захаваліся ў зямлі. Рэстаўратарам, чым будаваць, можна проста адкопваць замак.

## Хацелі разабраць на брук

Даводзіць Навагрaдскі замак да сённяшняга стану пачалі ў другой палове XVII ст. Падчас вайны з Масковіяй 1654—1667 гг. ворагі двойчы захоплівалі яго. У пачатку верасня 1655 г. Навагрaдак занялі казацкія аддзелы гетмана Залатарэнкі, замак і горад моцна пацярпелі падчас аблогі. Часткова адноўлены, у 1660 г. замак быў узяты ўжо без бою маскоўскімі войскамі пад загадам князя Хаванскага. Наёмны гарнізон, які не атрымаў своечасова аплаты за службу, проста адчыніў браму. У выніку ўсіх тых аблогаў частка вежаў, а таксама праслаў (сцены паміж вежамі) былі моцна пашкоджаныя. Апошні раз замак выконваў функцыі вайсковага аб'екта ў часе Паўночнай вайны ў 1706 г. Шведы ператварылі яго ў руіны.

Для расійскіх уладаў Навагрaдскі замак не быў аб'ектам сантыментаў. У пачатку XIX ст. нават быў дадзены загад яго разабраць, а каменнем забрукаваць вуліцы. Аднак дзве вежы засталіся амаль цэлымі. У канцы XIX ст. на замчышча праз пралом у муры пачалі звозіць з усяго Навагрaдка смецце. Слой яго над руінамі замка з часам дасягнуў двух метраў.

У 1906 г. рухнула частка Касцёльнай вежы. Дзякуючы намаганням мясцовых аматараў старажытнасцяў, рэшткі былі падпёртыя двума эскарпамі — мураванымі падмацаваннямі. Падчас першай сусветнай абвалілася паўднёвая сцяна вежы Шчытоўкі.

Польская дзяржава ў 1921 г. узяла замак пад ахову. У 1922 г. на Замкавай гары пачаліся даследчыя і выратавальныя працы, якія доўжыліся да 1931 г. Толькі дзякуючы тагачасным захадам, рэшткі Навагрaдскага замка дайшлі да нас. Частка сцен Касцёльнай вежы была складзеная практычна нанава.

## Рэстаўраваць або рэканструяваць?

З інжынерна-архітэктурнага пункту гледжання рэшткі вежаў знаходзяцца ў крытычным стане. І калі пачынаць нейкія працы, якая логіка павінна быць у аднаўленні замка? Што выбраць — кансервацыю ці рэканструкцыю? Кансервацыя прадугледжвае ўмацаванне наяўных аб'ектаў, іх ратаванне. Рэканструкцыя дазваляе аднаўляць знішчанае, але толькі паводле дакладных, навукова выверанных распрацовак іх ранейшага выгляду.

Вежы Шчытоўка і Касцёльная патрабуюць неадкладнай кансервацыі. Варта пазначыць увесь перыметр замкавых сцен, тым больш падмуркі іх захаваліся. І толькі цалкам знішчаныя вежы (Малая брама, Дазорца) могуць быць рэканструяваныя, гэта значыць цалкам адноўленыя.

Тое, што захавалася ад аўтэнтычных, спрадвечных муроў і вежаў замка, павінна быць максімальна захавана. Калі ж рабіць рэканструкцыю цалкам, тым самым сціраючы ўжо легендарныя абрысы навагрaдскіх вежаў, мы рызыкуем страціць і рэшткі тых гістарычных муроў, што захаваліся.



**Вежы Навагрaдскага замка, якія захаваліся на паверхні зямлі: Шчытоўка (на першым плане) і Касцёльная.**

PHOTO.BYMEDIA.NET




**Так выглядаў Навагрaдскі замак у часы найбольшай магутнасці. Рэканструкцыя.**

Рэканструкцыя Яўгена Куліка.

**У XVI ст. замак меў сем вежаў**

1. Дазорца (XV — п. XVI стст.), самая высокая вежа замка. Захавалася ў падмурках.
2. Шчытоўка (к. XIV ст.), захавалася часткова.
3. Касцёльная (к. XIV ст.), захавалася часткова.
4. Малая брама (к. XIV ст.).
5. Пасадская (к. XV ст.).
6. Меская (к. XV ст.), яшчэ адна брамная вежа, была пабудаваная дзеля ўмацавання Малой брамы і абароны падыходаў да Калодзежнай вежы.
7. Калодзежная (к. XV ст.). У замку, размешчаным на гары, калодзежа не было, але вада мелася ля падножжа, дзе на ўсходнім схіле білі крыніцы. Над адной з іх і была пастаўленая Калодзежная вежа.

**Як у іншых?**

Па сваім значэнні для краіны Навагрaдскі замак можна параўнаць з каралеўскай рэзідэнцыяй Вавель у Кракаве. Палякі яе аднаўлялі таксама мабілізуючы грамадства.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Кракаў трапіў у зону ўплыву Аўстра–Венгерскай імперыі. У былой каралеўскай рэзідэнцыі — замку на пагорку Вавель — размясціліся казармы. Польская грамадскасць Кракава доўга спрабавала выкупіць Вавель у аўстрыйскіх уладаў. Дзеля гэтага ў 1880 г. Сойм Кракава нават ахвяраваў замак асабіста імператару Францу Іосіфу.

Але той пагадзіўся вывесці войскі з Вавеля толькі ў 1905 г. Наўзамен горад за свой кошт збудаваў вайсковыя кашары (сённяшнія будынкі кракаўскай Палітэхнікі) і шпіталь.

Агульнанацыянальная акцыя збору сродкаў на аднаўленне Вавеля аб'яднала многіх палякаў — не толькі з «аўстрыйскіх» тэрыторый. Імёны фундатараў напісаныя на цаглінах — іх можна прачытаць на мурах, уздымаючыся на Вавель.

Выявы Вавеля сталі сімвалам Кракава і ўсёй Польшчы.




**19-ы тыраж латарэі «Скарбніца»**

ініцыявала Міністэрства культуры супольна з Гродзенскім аблвыканкамам і Навагрaдскім райвыканкамам. Мэта — сабраць сродкі на рэстаўрацыю (кансервацыю) Навагрaдскага замка. Усяго надрукавана 36 тысяч білетаў цаной па 2500 рублёў кожны. Гэта супастаўна з коштам дзвюх цаглін. Розыгрыш прызавога фонду латарэі 22 красавіка 2010 г.

Для збору ахвяраванняў:
Разліковы рахунак аддзела культуры Навагрaдскага райвыканкама №3632000001310 у АСБ «Беларусбанк» код 698 г. Навагрaдак, УНП 500031377 з адзнакай «На рэстаўрацыю Навагрaдскага замка».


PHOTO.BYMEDIA.NET

# На прэзідэнцкай лыжні

**Аляксандр Апон.**
Апавяданне.

### 1.

У кабінеце намесніка начальніка Казлоўскага райвыканкама па ідэалагічнай рабоце Уладзіміра Станіслававіча Рымшы былі двое: сам Уладзімір Станіслававіч, высокі, здаровы, шыракаплечы малады чалавек гадоў трыццаці, апрануты ў дарагі чорны гарнітур, і Антон Сяргеевіч Кулькін, старшыня Маларэцкага сельскага савета: маленькі, шчуплы, з хваравітым азызлым тварам мужычок перадпенсійнага веку. Таксама ў гарнітуры, але гэткім, як і сам гаспадар: зношаным, брудна-шэрага колеру, з латкай на рукаве і вылезлымі тамсям ніткамі з каўняра.

—Ты вось што, Кулькін. Ты гэта кінь — «не магу». Ты жонцы ў ложку кажы, што не можаш, а тут ты павінен. Прынамсі, пакуль займаеш пасаду старшыні сельсавета. А то мы цябе як пасадзілі, так ураз і здымем — вокам міргнуць не паспееш, — ідэолаг прамаўляў, разваліўшыся ў крэсле, толькі што не закінуўшы ногі на стол, ціхім, нібы прытомленым голасам , як настаўнік невуку.

—Дык, Уладзімір Станіслававіч, хіба я супраць, хіба я не хачу ці каму замінаю? Я сам калісь на дзесяць кіламетраў хадзіў... У школе заўсёды быў першым... і ў інстытуце таксама не з апошніх. У мяне нават грамата... недзе была, — мармытаў-апраўдваўся старшыня сельсавета, стоячы перад сталом і стараючыся глядзець у падлогу.

—Ерунда ўсё гэта, — нецярпліва махнуўшы рукой, перапыняе яго Уладзімір Станіслававіч, іранічна пры гэтым усміхаючыся. — Хадзіў ён, бачыце, некалі, грамата ў яго. А я некалі пад стол пяшком хадзіў, і што — гэта дае цяпер мне права не станавіцца на «прэзідэнцкую лыжню»? Адлыньваць? Ды які ты пакажаш прыклад народу? Не! Мне не трэба, каб пальцам потым паказвалі, — тыцкае ён сябе пальцам у жывот, — што ў цябе старшыні сельсаветаў на «прэзідэнцкую лыжню» не становяцца.

—Дык не магу я, сэрца ў мяне, памру я! — падняўшы галаву ўмольна выціскае з сябе Антон Сяргеевіч.

—Гм, сэрца, — хмыкае раённы ідэолаг.— А ў мяне, цябе паслухаць, сэрца няма? Не, вось што я табе скажу, Кулькін: раз хворы — звальняйся к чортавай матары і дома сядзі. Ці ў бальніцу кладзіся. І ўвогуле, — скрывіўшыся, бы з'еўшы нечага кіслага, дадае ён, — нешта я не ўцямлю: як ты, калі хворы, кіруеш сельсаветам? Не, усё, хопіць. Больш цацкацца я з табою не збіраюся. Заяву на стол — і да пабачэння. Ці табе дапамагчы напісаць?

—Дык, Уладзімір Станіслававіч, пабойцеся Бога, як жа я звольнюся?! — здаецца, вось-вось заплача Антон Сяргеевіч. — Мне ўсяго два гады да пенсіі засталося, майце ласку, дайце дарабіць. У мяне жонка Надзя нідзе не працуе, на ныркі хворая, і тры дачкі — старэйшая ў Мінску ва ўніверсітэце на платным, а малодшыя яшчэ школьніцы...

—Навошта ты мне гэта расказваеш? Я тваёй жонцы не доктар і да тваіх дачок як быццам сватацца не збіраюся, — адвярнуўшыся да акна пачынае наліваецца чырванню ад злосці Уладзімір Станіслававіч. «Вот жа сволач старая! — думае ён. — Два гады яму да пенсіі засталіся. А мне што? Мне грошы збіваць трэба, а не пра тваю сраную пенсію клапаціцца».

—Дык куды я пайду, куды падзенуся? — пытаецца між тым старшыня.

—Я ведаю? Гной ідзі ў калгас кідай, калі вілы падымеш, ці ферму вартаваць, — перасмыкнуўшы плячыма, злосна кідае Уладзімір Станіслававіч. І, як быццам гэта ён са сваей ласкі корміць, а не сам сядзіць поседам на карку ў народа, дадае:

—Мы не можам сабе дазволіць дармаедаў карміць.

—Які ж я дармаед! — усклікнуў, не вытрымаўшы, Антон Сяргеевіч. — Я толькі старшынёй сельсавета ўжо дваццаць пяць год запар сяджу, у мяне ніводнай вымовы і грамата ад прэзідэнта за бездакорную службу... недзе была.

—Як сядзіш, гэтак і злезеш! — падхопліваеца з месца Уладзімір Станіслававіч. — І граматай у нос мне тут не тыцкай. Знайшоў дзіва! Можаш ёй печ распаліць ці падцерціся.

### 2.

—Як жа — у печ, як — падцерціся? — не даючы веры сваім вушам, Антон Сяргеевіч глядзіць на партрэт над сталом. — Ён жа налева-направа не раздае, ён ведае, хто варты, там жа яго ўласнаручны подпіс... па-мойму, быў.

—« Уласнаручны подпіс... быў», — нахабна ўсміхаючыся, дражніць яго ідэолаг. — Ды мала каму прэзідэнт уласнаручна граматы падпісваў? Можа, ён памыляўся наконт цябе? Вунь, у «Советской Белоруссии» артыкул пра Снегіра чытаў? Можа, яму прэзідэнт прадстаўленне на медаль які падпісваў, і што? Адкуль прэзідэнт ведае, каму што падпісвае? А вось калі сказаў усе на лыжню — значыць, хоць трэсні, а ці памры, ці выканай! І толькі паспрабуй, выкінь каленца якое — у бальніцу легчы ці яшчэ што. Асабіста прасачу. Пойдзеш у мяне пад першым нумарам, толькі вецер свістаць за спіною будзе. Я вас усіх навучу прэзідэнцкія загады выконваць!

—Антон, Хрыстом Богам прашу, не хадзі ты ні на якую лыжню, пашкадуй ты нас! — казала вечарам таго самага дня яго жонка.

—Як жа я, Надзя, не пайду? — прысеўшы да стала, падпёр галаву рукою Антон Сяргеевіч. — Звольніць, далібог звольніць. Я ведаю. Гэта ён ужо на маё месца ці сваяка намеціў, які без пасады пакуль швэндаецца, ці каго збоку за грошы пасадзіць хоча. Зачэпку шукае.

—І што, управы на яго аніякай няма?

—Якая ўправа? — горка ўсміхнуўся Антон Сяргеевіч. — Ты хіба не ведаеш, што ён сынок старшыні райвыканкама? А звальненне — цяпер гэта ў іх лёгка. Бо навошта, думаеш, яны гэтыя кантракты павыдумлялі, нам на шыі панавешвалі?

—А можа, у вобласць паскардзіцца ці проста ў Мінск?

—А ў вобласці, у Мінску не тое самае? Эх, Надзя, Надзя! Няўжо ты не бачыш?

—Дык, можа, да доктара звярнуцца, хай даведку выпіша, што ў цябе сэрца хворае, арытмія, што табе па стану здароўя нельга?

—От, — адмахнуўся Антон Сяргеевіч. — У мяне гэтых даведак цэлы тузін. Толькі ці то справа ў лыжах ці каньках? Не з віламі ж насамрэч на старасці год у калгас падавацца. А так хоць ты з дзяўчатамі, пакуль непаўналетнія, нешта за мяне атрымліваць будзеш.

Надзя заплакала:

—Што ж ты сябе жывым хароніш? Можа, яшчэ абыдзецца як-небудзь?

—Можа і абыдзецца, — каб супакоіць яе, услых сказаў Антон Сяргеевіч.

—А казаў, што не магу, што хворы, — пад'ехаў да яго на старце «прэзідэнцкай лыжні», якая праходзіла ў Казлоўску ў нядзелю, Уладзімір Станіслававіч. Быў ён у чырвона-зялёным спартыўным гарнітуры з гербам на грудзях. — І глядзі мне, каб у ліку першых на фінішы быў. Я ўслед за табой пайду.

### 3.

«Ты, ты, ты в сердце моём», — грымела на ўвесь горад з рэпрадуктара, прыкручанага дротам да дрэва.

Але ні песня, ні пагрозы Уладзіміра Станіслававіча, ні што іншае навакол — нічога ўжо не даходзіла да Антона Сяргеевіча. Гэтак шалёна тахкала сэрца, што, здавалася, не вытрымае і ўзарвецца ў грудзях. І яго не сунімаў ні валідол, ні нітрагліцэрын, якія Антон Сяргеевіч браў і браў сабе пад язык.

«Канец», — падумаў ён, калі далі старт, і лыжнікі — у асноўным дзябёлыя вертыкальшчыкі і іх змена з БРСМ, — як статак кароў па камандзе пастуха, скрануліся з месца. Антон Сяргеевіч праз крокаў дзесяць, якія адмераў яму Бог на гэтай апошняй лыжні, упаў.

Калі прыехала «хуткая», ён ужо з палову гадзіны быў мёртвы.

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў.**

***

Прачытаў сярод «сведчанняў» міліцыянтаў на судах над тымі, хто святкаваў Дзень Волі (2008), паказанні нейкага сяржанта Рыбакова, якому, між іншым, 33 гады. Затрыманы ім маладафронтавец пытаецца: «А куды ж, у які бок мы ішлі? Вы павінны гэта ведаць, бо Вы кажаце, што мы з Вамі стаялі « твар у твар»? — і б е л а р у с к і міліцыянт узросту Хрыста крычыць у адказ: «Какой «твар»? Какой «твар»? У меня «лицо», а не «твар»! Не знаю я никакого «твара»!

І яшчэ геніяльны дыялог на судзе (суд над Кацярынай Красновай).

Адвакат: «За что вы задержали девушек?»

Скрыганоўскі (баец спецназа): «Они пытались прокрасться на каток».

Адвакат: «Что значить прокрасться?»

Скрыганоўскі: «Не понимаю вопроса».

Адвакат: «Каким образом они шли?»

Скрыганоўскі: «Каким-каким! Путем ходьбы на двух ногах в сторону катка...»

Паўза...

Адвакат: «А как вы их задерживали?»

Скрыганоўскі: «Мы заходили с фронта».

Колькі ні займайся літаратурай, хоць зубы аб яе абламай, а спецназаўца Скрыганоўскага не пераплюнеш.

***

З ганарарам за першую кнігу (амаль паўтары тысячы рублёў, шалёныя грошы) шыбую ад касы непасрэдна ў краму, але на выхадзе з выдавецтва мяне даганяе Барадулін: «Няма тут каму і за што прастаўляць, нясі грошы дахаты!..»

Быў 1976 год, Рыгор Іванавіч у застоллях яшчэ ўдзельнічаў, але ўжо не актыўна: наліваючы іншым, сам не піў. Кайфаваў ад успамінаў...

Ні з кім, апроч яго, піць мне ў выдавецтве не надта й хацелася... Але ж не ісці дахаты, не справіўшы рытуал.

Званю Вялюгіну. Так, маўляў, і так, трэба справіць рытуал, а Барадулін... «Бяры скрыню, — не даслухаў Анатоль Сцяпанавіч. — У мяне мора закусі».

Мора дык мора, скрыню дык скрыню... Крама ад дома Вялюгіна цераз дарогу, дакладней, цераз праспект, прыцягваю скрыню гарэлкі, а ў Вялюгіна на круглым стале пасярод гасцёўні насамрэч мора закусі: поўны тазік камсы.

Узнялі кілішкі над тазікам.

— Дык за цябе! — сказаў Вялюгін. — Ты Богам не пачуваешся?

Я падумаў, што ён пра кнігу, засаромеўся:

— Не, ну што вы, Анатоль Сцяпанавіч...

— А я пачуваюся. Гэтаксама, як мы з табой зараз у тазік, Бог з нябёсаў у акіян глядзіць.

***

Прыгавораны радыкальнымі ісламістамі да смерці, Салман Рушдзі, стаміўшыся жыць у схованках, стаў шукаць кантакты з братамі па веры, каб неяк з імі паразумецца. Ну, не хацеў ён абразіць Прарока, думкі такой не меў. Хацеў сказаць толькі, што там, дзе іслам, няма свабоднага грамадства — хіба гэта смяротны грэх?.. І, слухаючы яго па тэлефоне, адзін з правадыроў ісламскага свету, да якога Рушдзі звярнуўся па дапамогу, адказаў: «Пакуль мы з табой размаўлялі, мне жонка на нагах пазногці пастрыгла, а ты кажаш, што Каран — не святая кніга».

І паклаў трубку.

***

Стрыечны брат Лявон запрасіў у суботу (4.04.09) біць кабана ў Крыўску.

Забілі.

Дзень цёплы, сонечны... Найцяплейшы, як пасля мы дазналіся, за апошнія 63 гады. Значыць, гэткі красавіцкі дзень быў у 1946, калі я нарадзіўся. І хоць ён да мяне — ніякіх адносін, але чамусьці прыемна пра гэта думаць...

Але найцяплейшы не азначае найлепшы. Ва ўсякім разе, не найлепшы гэткі дзень для таго, каб кабана біць. Кроў не гусцее, цячэ і цячэ... Пах душны, цёпла-салодкі... Зусім не той — снежны, марозны, з якога ўрываешся ў хату, каб кульнуць чарку пад свежаніну. А тут ні чарка не кулялася, ні свежаніна не елася... Ну, не тое, каб зусім, але не ў смак, не ў смак.

Усё ў свой час рабіць трэба, усё ў свой час...

**АЛЕСЬ ЧОБАТ**

## Малітва
## да гісторыкаў

не будзьце свяцей сваіх народаў —
*тых* народаў няма, *гэтыя* вас не чуюць

не забудзьце засы́паць за сабой
усе ямы з раскопамі праўды

і не стойце на дарозе з рукой паднятай:
хто спазніўся, той не паспеў —

*нікога не давяла яшчэ да дабра*
*гісторыя пакутаў слёз і крыві*

не забывайце: «гісторыя ёсць навука
перапісвання тоўстых, але чужых кніжак
у свой тонкі, але агульны сшытак»



## Scorpions. Апошняе турнэ

У апошні раз паслухаць Клауса Майнэ са сцэны пра яго шпацыр па парку Горкага (балада Wind of Change) і пра яго ўпартую барацьбу за каханне (Still lovin' you) можна будзе **20 красавіка пад дахам «Мінск-Арэны» (пр.Пераможцаў, 111)**.

Нагадаем, сёлета хар–рокеры, якія сваёй творчасцю актыўна расхіствалі «жалезную сцяну» Берлінскага мура і настройвалі на рамантычны і паблажлівы лад мільёны сэрцаў (у тым ліку і савецкага генсека Гарбачова), абвесцілі пра заканчэнне сваёй зорнай (і часам паласатай) кар'еры. А перад выхадам з 40–гадовым стажам на заслужаную пенсію «Скарпы» едуць у развітальнае турнэ пад назовам Get Your Sting And Blackout. Сярод першых адрасоў гэтага турнэ — беларуская сталіца.

Квіткі: ад 75 000 да 225 000 рублёў, танцпляц — 150 000 рублёў, фан–сектар (гэта ля саменькай сцэны) — 200 000.






АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Штогод юраўскі абрад спраўляюць у вёсцы Пагост пад Туравам.**

## Юр'я

23 красавіка — Юр'я. Гэта ці не самае шматпланавае і насычанае рознымі сэнсамі свята, у якім спляліся паганскія і хрысціянскія традыцыі. Рытуал фармаваўся ад бронзавага веку да позняга Сярэднявечча. У вобразе Юр'я спляліся рысы славянска–германскага бога ўрадлівасці і пачуццёвага кахання Ярылы, латышскага апекуна коней Усіньша, і нават рымскага Януса, і, вядома, хрысціянскага святога Юр'я.

Свята Юр'я знаменавала сабой сапраўдны пачатак вясны, ці, шырэй, урадлівай паловы года. Надзвычай істотны элемент св. Юр'я — ключы, якімі ён замыкае зіму і адмыкае зямлю і вясну, выпускаючы на волю траву і расу.

Юр'я — ці не самая ўрачыстая дата гадавога кола беларусаў, рэшткі абрадавасці якой у некаторых мясцовасцях дайшлі да нашых дзён. Найбольш захаваўся звычай святочных агледзінаў (з песнямі і ахвярнымі стравамі) палеткаў з маладой руньню, які павінен забяспечыць добры ўраджай і ахову палёў ад стыхіяў. У паўднёвай Беларусі (Тураў) Юр'я — гэта найперш карагодная традыцыя: на маладым жыце бабулі разам з малымі водзяць карагоды і спяваюць абрадавыя песні. З Юр'ям зазвычай адбываўся і першы выпас жывёлы на цудадзейную юр'еўскую расу. У гэты дзень можна пахадзіць па той расе і самому: ад уроку і сямі хваробаў.

На Юр'я дбайны гаспадар не прапускаў без увагі стан надвор'я ў гэты дзень, рабіў высновы: «Як на Юр'я раса — хопіць коням аўса», «Як на Юр'я пагода, то на грэчку няўрода».

**ЛК**

## КАНЦЭРТЫ

### Зміцер Вайцюшкевіч у Магілёве і Мінску

**15 красавіка ў Магілёўскай акадэміі музыкі (вул.Інтэрнацыянальная, 30) а 18-й, 18 красавіка ў «Графіці» а 20-й і 28 красавіка на Малой сцэне тэатра імя Янкі Купалы** пройдуць канцэрты Зміцера Вайцюшкевіча.

### Прынашэнне Шапэну

**19 красавіка на сцэне Малой канцэртнай залы імя Р.Шырмы а 19-й** пачнецца канцэрт «Прынашэнне Шапэну» ансамбля салістаў «Класік–Авангард».

### «J:морс» — усе хіты

**21 красавіка ў к/з «Мінск»** гурт «J:морс» прадставіць праграму «10 год — усе гіты». **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

### Добры фэст

**22 красавіка ў «Рэактары» (вул. Харужай, 29)** — дабрачынны канцэрт пад назвай «Добры Фэст». Бяруць удзел гурты **IQ48, Neuro Dubel, B:N, ZM99** (Змяя) і **А. Хаменка** (гурт «Палац»). **Пачатак а 19-й.**

### Мінская Вясна-2010

Міжнародны фестываль «Мінская Вясна–2010» праходзіць **у Мінску**. Сёлета ён прысвечаны 200–годдзю з дня народзінаў Фрыдэрыка Шапэна і Роберта Шумана. **У Вялікай зале беларускай філармоніі 16 красавіка** выступае Варшаўскі сімфанічны аркестр. **18 красавіка** музыка Шапэна і Шумана будзе гучаць у выкананні дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь. **21 красавіка** — канцэрт фартэпіяннай музыкі. За раялем — Барыс Блох. **22 красавіка** — выступаюць Кірыл Родзін і Міхаіл Аляксандраў. **24 красавіка** — выступае трыа «Kaskados» (Літва). **У Малой зале імя Р.Шырмы 17 красавіка** выступае піяніст Андрэй Лімаеў. **Пачатак канцэртаў у 19.00.**

### «Ў нескладовае» ў «Рэактары»

**23 красавіка ў «Рэактары»** адбудзецца першае публічнае выступленне праекта «Ў нескладовае» — спробы паказаць свет, які акружае нас, праз музыку і вершы. Падмурак праекта — беларуская мова. Матор праекта — беларускі рок–н–рол.

### «Дні Беларускага слова» ў Маскве

**21—22 красавіка** — Міжнародны фестываль «Дні Беларускага слова» **у Маскве**. Праграма фестывалю: **21 красавіка: 16.00** — круглы стол «Руская і беларуская літаратуры: актуальныя праблемы ўзаемадзеяння»; **19.00** — лірыка BY: творчы вечар паэта і празаіка Адама Глобуса. **22 красавіка: 16.00** — адкрытая лекцыя філосафа Валянціна Акудовіча «Беларуская культура — свабодная прастора»; **19.00** — вечар беларускай паэзіі і прозы.

### Фестываль этнічнай музыкі ў Магілёве

**17 красавіка ў клубе-рэстаране «На Дуброўцы» а 17-й** пачнецца фестываль этнічнай музыкі Radavodar з удзелам этна–трыа **«Тройца»,** а таксама **Landers** (фолк–рок, Магілёў) і **«Гарынь»** (фолк, Мінск).

### +1 ГеніюшВерш

**Кожную нядзелю а 15-й у кнігарні Ўгалерэі (пр. Незалежнасці, 37а)** можна пачуць верш Ларысы Геніюш у выкананні аднаго з вядомых паэтаў.

## ВЫСТАВЫ

### Пагоня на Грунвальд

**У дзіцячай бібліятэцы №10 (пр. Незалежнасці, 123, корпус 3) да 2 мая** працуе мастацкая выстава, прымеркаваная да 600–годдзя Грунвальдскай бітвы.

### Леанід Баразна

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 18 красавіка** працуе выстава «Леанід Баразна. Спадчына», прымеркаваная да 80–годдзя з дня народзінаў майстра.

### Да 200-годдзя Івана Хруцкага

**У галерэях «Ракурс», «Лабірынт» і «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да 15 красавіка** працуе выстава «Ціхае жыццё», прымеркаваная да 200–годдзя з дня народзінаў І.Хруцкага. На выставе прадстаўлены жывапіс, графіка, фота, кераміка, бацік. Удзел у ёй бяруць каля 60 мастакоў з Беларусі, Расіі, Украіны, Сербіі, Арменіі, Вялікабрытаніі, Ірландыі, Латвіі, Польшчы, Францыі.

### Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) ад 16 красавіка да 10 мая** працуе выстава «Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі». Дакументы, фатаграфіі, газетныя публікацыі, кнігі, размешчаныя на выставе, раскажуць пра цікавую асобу — Рышарда Капусцінскага.

### Жывапіс у Нармандыі

**У Мастацкім музеі да 25 мая** працуе выстава «Жывапіс у Нармандыі». Гэты ўнікальны збор твораў мастацтва вандруе па свеце як калекцыя, якая паказвае зараджэнне імпрэсіянізму ў Францыі.

### Накіды і малюнкі расійскіх мастакоў

**Да 24 красавіка ў Мастацкім музеі** працуе выстава «Накіды і малюнкі рускіх мастакоў XIX—XX стст. са збораў музея». На выставе прадстаўленыя накіды І.Шышкіна, Я.Волкава, Б.Кустодзіева, Ф.Малявіна, К.Рудакова, В.Сярова. Большая частка графічных лістоў экспануецца ўпершыню.

### Халодная зброя

**У музеі Вялікай Айчыннай вайны да 1 чэрвеня** працуе выстава «Халодная зброя. Традыцыі і сучаснасць».

### Ваенна-гістарычная мініяцюра

**У Гістарычным музеі да 30 мая** працуе выстава Ігара Гарбунова «Ваенна–гістарычная мініяцюра». На выставе прадстаўленыя мініяцюры воінаў Старадаўняга Рыма, галандскіх воінаў…

## ТЭАТРЫ

### 15 красавіка

**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

### 16 красавіка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Тэатр лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»

### 17 красавіка

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна–жабка»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

### 18 красавіка

**Тэатр лялек** — «Чароўная лямпа Аладзіна»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Тэатр оперы і балета** — «Рыгалета»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

### 19 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Карусель»

### 20 красавіка

**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Тэатр оперы і балета** — «Русцер»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»

## КІНО

### Акіра Курасава

**У Музеі гісторыі беларускага кіно (вул.Свярдлова, 4)** — рэтраспектыва фільмаў рэжысёра Акіры Курасавы «Імператар японскага кіно», прысвечаная стагоддзю з дня яго нараджэння. **14 красавіка** — «Трон у крыві»; **16 красавіка** — «Чырвоная барада»; **21 красавіка** — «Пад стук трамвайных колаў»; **23 красавіка** — «Цень воіна»; **28 красавіка** — «Смута»; **30 красавіка** — «Сны». **Пачатак сеансаў а 15-й і ў 18.30.**

## Дзецям да 25 глядзець забаронена

**«Хлоя»**, Канада–ЗША–Францыя, драма/трымценнік, 96 хв., рэж. Атам Эгаян, у ролях — Джуліян Мур, Лаям Нісан.




Чаму распадаюцца шчаслівыя шлюбы? Чаму каханне было і раптам няма?

Канадскі рэжысёр Атам Эгаян зняў кіно не для ўсіх, а толькі для людзей, якія не вераць казачным «і жылі яны доўга і шчасліва» ды якія ўжо здагадаліся, што пасля вясельнай эйфарыі змаганне за каханне толькі пачынаецца… «Хлоя» — аповед пра тое, што ў каханні няма ні кепскіх, ні добрых, і сяды–тады здрада нават ператвараецца ў збавенне, а дэман — у анёла. Так–так, самы час клікаць па помач Фройда і Юнга, экспертаў па іншаму боку маралі і перакладчыкаў старажытных міфаў на мову сучаснага чалавека.

Ён — заможны прафесар, Яна — паспяховая гінеколаг, Яно — загадкавая выляжанка Хлоя, якая прыгасяродку спакусы з утрапёнасцю тагасветнай істоты і спрабуе знішчыць (захаваць?) сям'ю.

Да слова кажучы, «Дафніс і Хлоя» — адзін з першых любоўных раманаў чалавецтва, які ці не ўпершыню ў гісторыі нашай цывілізацыі апяяў людскую пачуццёвасць і эратызм і зрабіў ягоных герояў сінонімамі полавага поцягу. І таму канадская Хлоя (Аманда Сэйфрыд, «Мама мія!»), закінутая па волі сцэнарыста з пракаветных часоў папрысутнічаць–паўдзельнічаць у сучасных любоўных сплётах, мае толькі адну зброю — не стрыманую ніякімі рамкамі сэксуальнасць. Місія дэманічнай Хлоі амаль невыканальная: аднавіць сям'ю і даць рады крызісу сярэдняга ўзросту сваіх гадаванцаў, зацвердзіўшы, што ў жыцці заўсёды ёсць месца сэкс–подзвігу…

Каб канчаткова не занураць гледача ў задушлівую рэчаіснасць міфаў і архетыпаў, якія паводле псіхааналітыкаў па–ранейшаму пануюць над намі, рэжысёр патурбаваўся пра іронію, стварыўшы камічны вобраз сына–падлетка з поўным букетам тынэйджэрскіх комплексаў (яго сыграў Майкл Т'ерыёт), а таксама фразы, якія выдатна характарызуюць наш час. Чаго вартая рэпліка галоўнага героя Дэйвіда (Лаям Нісан, «Спіс Шындлера»): «Мне нельга канчаць — мне яшчэ на працу».

Паколькі гэта пастаральны раман, у якім усе любоўныя перажыванні павінны адбывацца на тле маляўнічай прыроды, яго дзеянні перанесеныя на фон стылёвых, дрэва і бетон, вілаў, а таксама дзівосных, калі не сказаць фантастычных, урбан–краявідаў Таронта.

Мёртвы ўхоп Галівуда ў выглядзе хэпі–энда дабраўся да фільма адно пры канцы. Усё роўна як у старагрэцкім рамане, дзе ўся праўда пра мінулае раскрываецца, а галоўныя героі бяруцца шлюбам, так і ў стужцы супружнікі, нягледзячы на ўсё прыкрае, міряцца і наступае шчаслівая развязка. Амаль шчаслівая, трэба заўважыць (фільм жа старагрэцкі, выбачайце, канадскі).

У стужцы шмат сцэн з галізною, таму дзецям да 16 гадоў уваход на яго забаронены, а таксама не менш сцэнаў шматслойных любоўных пакут, так што дзецям да 25 таксама глядзець не варта — не зразумеюць.

**ЛК**

# Усміхайцеся, і вас зразумеюць

**Базавыя эмоцыі — весялосць, злосць, страх і сум — з'яўляюцца ўніверсальнай мовай, аднолькава зразумелай усім моўным і этнічным групам людзей. Яны пазначаюцца гукамі, эмацыйная афарбоўка якіх аднолькава ўспрымаецца людзьмі незалежна ад моўнага, нацыянальнага і культурнага фону.**



Прыналежнасць усіх людзей да аднаго і таго ж віду пацверджаная шматлікімі прыкметамі — генетычнымі і марфалагічнымі. Акрамя таго, усе мы валодаем аднолькавай складанай сістэмай зносінаў, з дапамогай якой можам перадаваць нашы думкі, пачуцці і намеры людзям вакол нас. З дапамогай мовы, гукаў, выразу твару і паставы мы можам растлумачыць адзін аднаму самае шырокае кола эмоцый і адчуванняў. Аднак тут пачынаюцца моўныя адрозненні, прычым у людзей з розных краін яны тычацца не толькі слоў, але і «мовы цела» — позаў і жэстаў.

Але базавыя эмоцыі з'яўляюцца ўніверсальнай моваў для ўсіх людзей на Зямлі. Смех, злосць, страх і сум аднолькава перажываюць усе людзі, сцвярджаецца ў працы, апублікаванай у Proceedings of the National Academy of Sciences.

Група брытанскіх навукоўцаў паспрабавала правесці «універсалізацыю» эмоцый, даследуючы гукі, што вымаўляюць людзі, адчуваючы шчасце, злосць, страх, сум, агіду і здзіўленне. Для параўнання браліся адпаведныя эмоцыі ў жыхароў Вялікабрытаніі, а таксама народнасці хімба — групы з 20 тысяч чалавек, якія жывуць у невялікіх вёсках на поўначы Намібіі. Калі брытанцы жывуць звычайным жыццём сучаснага чалавека, дык хімба існуюць у цалкам традыцыйным свеце — без электрычнасці, вадаправода, адукацыі і ўвогуле кантакту з людзьмі іншых этнасаў і сацыяльных груп.

Добраахвотнікам, якія ўдзельнічалі ў даследаванні, прапаноўвалася праслухаць кароткую гісторыю, створаную вакол пэўнай эмоцыі (напрыклад, апавяданне пра сум чалавека, у якога нядаўна памёр нехта з родных). У канцы гісторыі чуліся два гукі — напрыклад, плач ці смех, і чалавека прасілі праасацыяваць з тэкстам адзін з іх. Пры гэтым брытанцам прапаноўваліся плач і смех людзей хімба і наадварот.

Замена «нацыянальнасці» плачу не перашкодзіла людзям ацаніць яго эмацыйную афарбоўку — і брытанцы, і хімба паспяхова распазнавалі ў «чужых» гуках праявы злосці, страху, радасці, суму і здзіўлення.

Такім чынам, навукоўцы давялі, што базавыя эмоцыі з'яўляюцца агульнай моваў людзей, якая была закладзеная першапачаткова, а не развілася ў дынаміцы культур, рас і нацый. Раней было ўстаноўлена, што людзі розных нацыянальнасцяў і моўных груп здольныя паспяхова распазнаваць эмоцыі адзін аднаго па выразе твару, нягледзячы на прыкметныя адрозненні ў мускулатуры тварaў.

Асабліва добра распазнаюць людзі самы пазітыўны гук — смех. «Слухачы» абедзвюх нацыянальнасцяў патлумачылі, што смех з'яўляецца знакам радасці або весялосці, прывёўшы самы просты прыклад — адчуванне ад казытання.

«Казытанне — яшчэ больш універсальная «эмоцыя», яна зразумелая не толькі людзям, але і іншым сысунам, у прыватнасці, шымпанзэ. Гэта дазваляе выказаць здагадку, што смех мае больш глыбокія эвалюцыйныя карані. Магчыма, ён узнік як частка вясёлай гутаркі мамы і яе нованароджанага дзіцяці», — адзначаюць навукоўцы.

Аднак універсальнасць, уласцівая смеху, не з'яўляецца уласцівацю ўсіх пазітыўных гукаў. Напрыклад, гук задавальнення наогул з'яўляецца спецыфічным для пэўнай групы сацыяльнай і моўнай супольнасці. Магчыма, больш складаныя пазітыўныя эмоцыі служылі для згуртавання соцыуму, таму сталі больш спецыфічнымі, забяспечваючы дыферэнцыяцыю на «сваіх» і «чужых».

**КаМ**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Суп з гусіных вантробаў

Вантробы з 1 гусі, 2 морквы, 1 пятрушка, 1 сельдэрэй, 1 парэй, 1 цыбуля, 1—2 шклянкі смятаны, 4—5 грыбоў, 1 шклянка ячных круп, 1 лыжка масла, 2—3 лаўровых лісты, некалькі зярнят простага і англійскага перцу, зеляніна пятрушкі, кропу, соль.

Для галак: гусіная пячонка, булка, масла, жаўток, яйка.

Зварыць булён з розным карэннем, палажыць у яго вантробы гусі (акрамя пячонкі) і варыць як звычайна. Асобна зварыць ячную кашу на адвары сухіх грыбоў, заправіць маслам, потым смятанай і ўвесці ў булён з вантробаў.

Гусіную пячонку дробна нарэзаць, змяшаць з цёртай булкай, дадаць трохі масла, жаўток, яйка, перамяшаць і з гэтага фаршу вырабіць маленькія галачкі, зварыць іх у супе.

Калі падасца, што суп недастаткова кіслы, можна дадаць у яго праваранены бурачны расол.

**З кнігі «Вялікалітоўская (беларуская) кухарка», выдала М. Станкевічыха ў Нью-Ёрку (1959), падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншуем Алену і Аляксея Мінчонкаў** з нараджэннем сына Тамаша. Расці здаровы і разумны! Сябры.

**КУРСЫ МОВЫ І ГІСТОРЫІ**

**ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны» арганізуе бясплатныя заняткі** па беларускай мове і гісторыі для школьнікаў 7–х — 9–х класаў. Заняткі праводзяць вядомыя педагогі, кандыдаты навук, выдатнікі адукацыі Беларусі. Заняткі праходзяць кожны аўторак ад 16.00 да 18.00 у памяшканні ТБМ (Мінск, Румянцава, 13, каля ст.метро «Плошча Перамогі»). Даведкі праз т.: (017) 284–85–11, (029) 639–27–15.

**КНІГІ, КІНО**

**Шукайце дыскі** з дакументальным фільмам «Журналісты» (рэжысёр — Алег Дашкевіч) пра лёс незалежнай журналістыкі на выставе Управы БНФ (Машэрава, 8).

**Пяты выпуск факсімільнага выдання «Першае беларускае газэты з рысункамі»** за 1912 — 1915, 1920 гады знойдзеце ў Інтэрнэт–краме www.Prastora.by. Даведкі па т.: (029) 707–79–89, (044) 762–78–80, (025) 618–85–35. beltonmedia@gmail.com

**ПРАДАМ**

**Аўто KIA Pride, 1998 г.** Аўтамат. Прабег 163 тыс. км. Колер: біруза. Тып кузава: хэтчбэк. Аб'ём: 1300 куб. см. Дзвераў: 5. Бензін. Падушка бяспекі кіроўцы. У 2005 з Германіі, у Беларусі першы ўласнік. Ніколі не бітая, праўдзівы прабег. Нармальна бегае, ніколі не было праблем з рухавіком і каробкай, у каробцы заменена аліва. Лёгкая ў рамонце, таму што большасць запчастак — як для «Мазды–121». + Зімовая рызіна. 2700 даляраў. Т.: (029) 551–59–45, (029) 872–26–35.

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем** у падарожжа Прага—Дрэздэн 13—17 траўня. Т.: (017) 292–54–58; (029) 622–57–20; 509–12–16.

**Падарожжа Рым —Ватыкан** 19.04–27.04.2010 (320 Еўра). Нягледзячы на тое, што арганізатарам з'яўляецца Рымска–каталіцкі касцёл, пілігрымка разлічана на шырокае кола людзей. Умовы паездкі не прадугледжваюць узроставага абмежавання, а веравызнанне не мае значэння. У пілігрымку запрашаюцца дзеці і дарослыя, праваслаўныя, пратэстанты і каталікі. Суправаджаюць пілігрымку святар і гіды–перакладчыкі. Экскурсіі выключна на беларускай мове. Даведкі па т.: (029) 618–72–99, 518–72–27.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ТЭХНАЛОГІІ

## «Белтэлекам» запусціў сетку WiMAX у Мінску

«Белтэлекам» аб'явіў аб пачатку тэставакамерцыйнай эксплуатацыі сеткі бесправаднога шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт WiMAX у Мінску. На першым этапе сетка стандарту IEEE 802.16e пабудавана на аснове 22 базавых станцый кампаніі Huawei, якія працуюць у дыяпазоне частаты 3,5 ГГц.

Доступ у інтэрнэт на базе тэхналогіі WiMAX будзе прадстаўлены гандлёвай маркай byfly. Абанентамі па першым часе будуць фізічныя асобы. Пры заключэнні дамовы яны будуць атрымліваць USB-мадэмы. Для кліентаў, якія ўпершыню стануць выкарыстоўваць WiMAX, прадугледжаны тэставы перыяд.

Пакрыццё Мінска сеткай WiMAX забяспечваецца 22 базавымі станцыямі, радыус дзеяння кожнай з якіх дасягае прыблізна кіламетр. У залежнасці ад шчыльнасці забудовы пакрыццё тэрыторыі радыёсігналам можа звужацца.

Колькасць базавых станцый на першым этапе дазваляе кропкава пакрыць радыёсігналам пэўныя раёны горада, таму пакуль пры пераходзе з зоны дзеяння адной базавай станцыі ў зону дзеяння другой неабходна перападключацца да сеткі.

**БелаПАН**

**WiMAX**

(англ. Worldwide Interoperability for Microwave Access) — тэлекамунікацыйная тэхналогія, створаная для аказання абанентам паслуг сувязі на вялікіх адлегласцях, у тым ліку і шырокапалоснага бесправаднога доступу ў інтэрнэт. WiMAX дазваляе падключыцца абанентам да сеткі інтэрнэт на хуткасці да 15 Мбіт/с у радыусе кіламетра. Патэнцыял тэхналогіі дазваляе ствараць бесправаднныя высакахуткасныя сеткі ў маштабах гарадоў, не прывязваючы карыстальнікаў да пэўнага геаграфічнага пункта. WiMAX працуе ў дыяпазоне радыёхваляў ад 1,5 да 11 Ггц, у якім рэалізаваны стандарты для фіксаванага (стандарт IEEE 802.16d) і мабільнага (стандарт IEEE 802.16e) WiMAX.

АЎТА

## Volkswagen Polo прызнаны найлепшым аўтамабілем года




**Конкурс World Car Of The Year (WCOTY)** заснаваны ў 2004 годзе. Пераможцамі з тых часоў станавіліся:

**2005** — Audi A6
**2006** — BMW 3–Series
**2007** — Lexus LS460
**2008** — Mazda 2
**2009** — Volkswagen Golf VI.

Журы конкурсу World Car Of The Year, што складаецца з 59 аўтамабільных журналістаў з 25 краін свету, назвалі гэтую мадэль. Сёлета гонку па ганароваe званне распачыналі 30 кандыдатаў. Да фіналу дайшлі толькі трое: Mercedes-Benz E-Class, Toyota Prius і Volkswagen Polo. Перамога Polo стала другой запар для кампаніі Volkswagen. Летась фаварытам журналістаў стаў еўрапейскі лідэр продажаў Volkswagen Golf.

Яшчэ журы вызначыла найлепшы дызайнерскі праект года — Chevrolet Camaro, найлепшае аўто высокай магутнасці — Audi R8 V10 і найлепшы экалагічны аўтамабіль — серыя Volkswagen BlueMotion (Golf, Passat, Polo).

**Алесь Чарняковіч**

КЕМІКІ

## Пытанні на кемлівасць

1. Ног не мае, а бяжыць.
2. Што на свеце самае багатае?
3. Фарбай яго не фарбавалі, а яно сіняе.
4. Што робіць вартаўнік, калі ў яго на галаве сядзіць верабей?
5. Пад якім кустом сядзіць заяц, калі ідзе дождж?
6. Ноччу свечачкі гараць, а іх ніхто не запальвае.
7. Агнём не гарыць, а ўсім нам свеціць.
8. Без рук, а ў акно стукае.
9. Якія ў возеры каменьчыкі?
10. Чаму карова кладзецца?
11. У лесе расце, ніколі не цвіце.
12. Вады няма, а яны плаваюць.
13. Без рук, без алоўкаў на шыбах узоры малюе.



**Сабрала Валянціна Карнялюк**




Так выглядае павільён Беларусі на выставе «Экспа-2010», якая пройдзе ў Шанхаі. Гэта першы ўдзел нашай краіны на Сусветнай выставе. Аўтар карціны, намаляванай на сценах павільёна, — мінскі мастак Ігар Рымашэўскі.

## АНЕКДОТЫ

* * *

Здам кватэру на 5—7 гадоў, у залежнасці ад рашэння суда.

* * *

Нашага войска ўсе баяцца! Асабліва тыя, каму ад 18 да 27 гадоў.

* * *

Дайвер з падводнага ружжа падстрэліў кашалота. Кашалот вельмі ўзрадаваўся, бо дагэтуль дайвера не заўважаў.

* * *

Памятка для гасцей. «І не забывайцеся пра этыкет. Відэльцы ў левую кішэню, нажы — у правую».

* * *

У нашым сямейным бюджэце жонка лічыць мяне адукацыяй і культурай.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Мінск.** У крэдытна-зберагальным таварыстве, дзе сядзіць вядомы ўсім ацэншчык Дзевачка, вельмі цяжка дастаць пазыку. Даюць яе толькі тым, у чыіх вачах Д-ка бачыць такія думкі: «Я, паночку, верны твой староннік па выбарах і «поўбутэлечнік», калі дастану ад вас пазыку, а з ёй і права падаваць свой голас на выбарах, дык праз увесь век свой не памкнуся выбіраць другога на тваё «хлебнае» месца».

**«НН». №14. 1910**

Універсітэтаў, як грazі. У Магілёве з'явіўся днямі яшчэ адзін універсітэт. Статус такі надалі Магілёўскаму машынабудаўнічаму інстытуту. Як жартуюць смехачы, хутка па колькасці ўніверсітэтаў на душу насельніцтва Магілёўшчына апярэдзіць найбуйныя сталіцы Еўропы. А што вы думалі? Цяпер у вобласці іх аж 5.

**«НН». №14. 2000**



PHOTO.BYMEDIA.NET

GAZETABY.COM

Запускаць мыльныя бурбалкі стала веснавой традыцыяй у розных гарадах свету. Такое дзіцячае свята вырашылі зладзіць 11 красавіка і мінчукі ў цэнтры сталіцы.



Арамнаў вярнуўся. Барысаўскі штангіст, які летась апынуўся ў цэнтры алкагольнага скандалу, перамог на чэмпіянаце Еўропы ў Мінску.

Пункт гледжання.




COMICS_BY.LIVEJOURNAL.COM



DRUGOI.LIVEJOURNAL.COM

У Маскве ў маўзалеі рамонт. Заклеілі нават надпіс «Ленін», што асабліва весяліць людзей. Для моладзі: у маскоўскім маўзалеі захоўваецца цела Леніна, лідэра расійскай рэвалюцыі 1917-га. У савецкі час наведванне яго было абавязковым для ўсіх турыстаў, што адведвалі Маскву.

**Адказы на пытанні са старонкі 15:**

1. Вада, 2. Зямля. 3. Неба. 4. Спіць. 5. Пад мокрым. 6. Зоркі на небе. 7. Сонца. 8. Вецер. 9. Мокрыя. 10. Бо сядзець яна не ўмее. 11. Папараць. 12. Яблыкі. 13. Мароз.

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6320.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.04.2010.

Замова № 1741.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.

Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614